Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 САКАВІКА 2015 г. АЎТОРАК № 40 (27898) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Беларуская электраэнергія... на экспарт**

СТАР. 4

**Гераіня легендарнай кнігі**

СТАР. 7

*ЦЫТАТА ДНЯ*

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

***«У краіне разгарнуўся дыялог бізнесу і ўлады, прычым дыялог шматбаковы, шматступенны. Дзяржава прапанавала бізнесу паўдзельнічаць у фарміраванні праграмы ўрада, у шэрагу стратэгічных праграм мы ўдзельнічаем. Беларускі бізнес сёння разнастайны, інавацыйны, ён вырабляе, экспартуе прадукцыю ў больш чым 100 краін свету. Мы заклікаем да таго, каб ён быў канкурэнтаздольным. Зразумела, што паласатымі торбамі канкурэнцыю не створыш, але ў той жа час прадпрымальнікі і ўлада павінны чуць адзін аднаго. Важна тое, што ўрад прыслухаўся да меркавання бізнес-асацыяцый у пытанні індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку. З улікам таго, што Беларусь з'яўляецца членам Еўразійскага эканамічнага саюза, нашы ўмовы для гэтага бізнесу не павінны быць горшымі, чым у іншых краінах — членах ЕАЭС».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14960,00 | ▲ |
| Еўра | 16710,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 240,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 569,90 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Прыстань крылатых вандроўнікаў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Валерый Балаш, адзіны жыхар вёскі Чамкі на Лагойшчыне, з нецярпеннем чакае прылёту птушак з выраю. Шпакі да яго, як сцвярджае гаспадар, заўжды вяртаюцца перад 8 сакавіка.**

■ Надвор'е

## Зноў снег і падмарозіць

### А на 8 сакавіка чакаецца да плюс 9 і дождж

**У аўторак пад уплывам вільготнай паветранай масы месцамі па краіне пройдзе дождж і мокры снег, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 2-7 градусаў. У сераду і чацвер да нас завітаюць сур'ёзныя атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы. Менавіта яны прынясуць уначы на сераду ў асобных раёнах, а ўдзень паўсюдна кароткачасовы снег і мокры снег. Такія ападкі будуць гаспадарыць у нас у большасці раёнаў уначы на чацвер і месцамі ўдзень. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы падмарозіць да 0 — мінус 6 градусаў, а ўдзень чакаецца ўжо ад 0 да 6 цяпла. У пятніцу і суботу надвор'е зноў зменіцца і ападкі чакаюцца ўжо ў выглядзе непрацяглага снегу. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 0 да мінус 5 градусаў, а пры праясненнях да 7 марозу. Удзень чакаецца ад 0 да 5 цяпла, а на поўдні да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у нядзелю — на жаночае свята — толькі па паўночным захадзе краіны чакаецца ўжо кароткачасовы дождж. Месцамі ўдзень будзе нават параўнальна цёпла і сонечна. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да мінус 7 градусаў, удзень — 2-9 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Прамая лінія «Звязды»**

## НА СУВЯЗІ — МІНІСТР ЖКГ

Ці будуць у найбліжэйшы час павялічвацца тарыфы на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі? За кошт чаго і калі можна чакаць павышэння якасці абслугоўвання насельніцтва і аб якіх новых метадах эфектыўнага зніжэння сабекошту паслуг можа ісці гаворка? Якім чынам у найбліжэйшай будучыні запланавана ажыццявіць рэформу ЖКГ?

На гэтыя і іншыя пытанні чытачам «Звязды» адкажа **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны Аляксандр Аляксандравіч ЦЕРАХАЎ падчас прамой лініі, якая адбудзецца ў рэдакцыі газеты ў сераду, 4 сакавіка, з 12.00 да 13.00.**

Каб папярэдне пакінуць свае пытанні, дасылайце іх на электронны адрас (info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «Прамая лінія»-ЖКГ) ці тэлефануйце па нумарах: 287-17-51, 292-38-02.

# Заслужаныя ўзнагароды

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб узнагароджанні прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, значны асабісты ўклад у развіццё навукова-педагагічнай дзейнасці, сферы аховы здароўя, культуры і спорту. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У ліку ўзнагароджаных ордэнам «За службу Радзіме» III ступені — намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі Юрый Караеў.

Медаля «За адвагу» ўдастоены начальнік аддзялення баявога забеспячэння — начальнік сапёрна-піратэхнічнай службы вайсковай часці 5525 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Мікалай Нагурны, старшы інструктар кіналагічнай службы (сапёр) сапёрна-піратэхнічнай групы гэтай жа вайсковай часці Юрый Навуменка.

Сярод узнагароджаных медалём «За выдатнасць у ахове грамадскага парадку» — намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі — начальнік аддзела па масавых мерапрыемствах міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Басаў, а таксама начальнік аддзела дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі УУС адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Аляксандр Васілевіч.

Медалём «За выдатнасць у ахове дзяржаўнай мяжы» адзначаны кантралёр-інструктар аддзялення пагранічнага кантролю 86-й пагранічнай групы пагранслужбы Аляксандр Дзімчогла.

У ліку ўзнагароджаных медалём «За выдатнасць у прадухіленні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый» — старшы пажарны Горацкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Раемскі, медалём «За працоўныя заслугі» — станочнік ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў» — Завод струганай шпоны і мэблі» Міхаіл Шытаў, медалём Францыска Скарыны — загадчык кафедры маркетынгу Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Іван Акуліч.

Сярод удастоеных ганаровых званняў — галоўны ўрач Гарадской гінекалагічнай бальніцы Мінска Аляксандр Біч, якому прысвоена званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена начальніку цэха пратэзна-артапедычнага абутку Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра Аляксандру Маўкаленку, старшыні цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства глухіх Сяргею Сапуту і іншым.

■ Адкрыты дыялог

# ПАВУЧЫЦЦА Ў МАЛАДЫХ

**Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса з усіх рэгіёнаў краіны азнаёміліся з вопытам сталіцы па рабоце з моладдзю, развіцці інавацыйнага патэнцыялу маладых грамадзян.**

Удзельнікі выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання наведалі камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Маладзёжная сацыяльная служба», дзе дзейнічае бізнес-інкубатар і створаны спрыяльныя ўмовы для маладых прадпрымальнікаў. Ім здаюць у арэнду абсталяваныя ўсім неабходным офісныя памяшканні па льготных стаўках. А індывідуальныя прадпрымальнікі па аказанні юрыдычных і бухгалтарскіх паслуг заўсёды пракансультуюць сваіх калег, што працуюць побач. Прычым за сімвалічную плату, а то і бясплатна. Усё гэта паўплывала на тое, што выжыванне прадпрыемстваў складае 93%.

Дапамагае юным бізнесменам і Мінгарвыканкам. На працягу 2009—2014 гадоў з мясцовага бюджэту ім выдаткавана больш як 16 млрд рублёў. Як паказала практыка, такое рашэнне апраўдана. За час работы інкубатара яго прадпрыемствы прынеслі ў бюджэт звыш 26 млрд рублёў, стварылі 575 працоўных месцаў. Такім чынам, пры затратах на адно месца 28 млн рублёў выплачана падаткаў у памеры 45 млн рублёў.

Дэпутаты прыйшлі да высновы, што маладзёжныя бізнес-структуры неабходна стварыць у кожным раёне краіны.

— Неабавязкова такія маштабныя, як у Мінску, — адзначыў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Але гэта павінен быць каталізатар ідэй маладых людзей, дзе ім дапамогуць увайсці ў самастойнае жыццё. Бізнес-інкубатары — своеасаблівыя пляцоўкі зносін для бізнесменаў-пачаткоўцаў, дзе яны вучацца адзін у аднаго.

Фота БЕЛТА.

Міхаіл Мясніковіч лічыць, што ў краіне ёсць сістэма бізнес-інкубатараў, але яна павінна быць больш жывой. А для гэтага трэба шукаць творчых, ініцыятыўных куратараў.

Разам з тым старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што маладзёжны бізнес-інкубатар выходзіць за межы Мінска, гатовы працаваць з рэгіёнамі. Але тут няма неабходнасці прымаць нейкае кіраўнічае рашэнне, бо павінны быць узаемныя згода і жаданне.

У маладзёжным асяродку ўвогуле сканцэнтраваны вялікі патэнцыял. «Задача органаў улады — садзейнічаць яго прыцягненню да сацыяльна-эканамічнага развіцця. Праекты, што ініцыюе моладзь, заслугоўваюць таго, каб быць рэалізаванымі на прадпрыемствах — як новых, так і дзеючых», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

Падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання адбыўся таксама адкрыты дыялог з членамі Маладзёжнай палаты 4 склікання пры Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце. Юныя парламентарыі цікавіліся ў Міхаіла Мясніковіча рознымі аспектамі сучаснага грамадскага і эканамічнага жыцця і нават падказвалі шляхі вырашэння праблем. У прыватнасці: як падтрымаць айчынны прыватны бізнес, арганізаваць уступную кампанію і тэсціраванне, прыцягнуць моладзь у навуку.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

■ Чакаем

# ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ДАЛІ АДТЭРМІНОЎКУ

## Новы ўказ па рэалізацыі прадукцыі лёгкай прамысловасці адлюструе парытэт інтарэсаў улады і бізнесу

**Усе іпэшнікі могуць працаваць спакойна. Пасля 1 сакавіка для іх нічога не змянілася, прынамсі пакуль. Пра гэта заявіў у суботу намеснік міністра эканомікі Дзмітрый КРУТЫ. Ён удакладніў, што эксперты ведамства сумесна з прадстаўнікамі бізнес-саюзаў і бізнес-асацыяцый распрацоўваюць праект канчатковага нарматыўна-прававога акта, які ўрэгулюе рэалізацыю рэшткаў прадукцыі легпрама.**

### НІЯКІХ САНКЦЫЙ

У адпаведнасці з нормамі Указа №222 ад 16 мая 2014 года, з 1 сакавіка сёлета ў індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку заканчваецца перыяд, падчас якога яны маглі рэалізаваць рэшткі прадукцыі лёгкай прамысловасці, увезенай з краін Мытнага саюза без дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё і паступленне гэтых тавараў. «Кіраўнік дзяржавы, прымаючы справаздачу ўрада па бягучых эканамічных пытаннях, даручыў неадкладна вырашыць гэтую праблему», — растлумачыў Дзмітрый Круты.

Такім чынам, кантралёры не будуць прымяняць санкцыі да індывідуальных прадпрымальнікаў, якія не маюць дакументаў на тавары лёгкай прамысловасці да прыняцця новага ўказа. «У праекце дакумента мы пастараемся адказаць на самыя надзённыя пытанні: канчаткова выпрацаваць механізм па легалізацыі рэшткаў тавараў; стварыць роўныя ўмовы пры разавай рэалізацыі паміж замежнымі грамадзянамі і грамадзянамі Беларусі; вызначыць адзіны механізм для нашых кантрольных органаў па выяўленні фактаў фальсіфікаваных дакументаў; выпрацаваць канчатковую прававую аснову для нашых індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць увесь пакет дакументаў па пераходзе на спрошчаную сістэму падаткаабкладання. І нарэшце — максімальна вырашыць пытанне па наяўнасці суправаджальных дакументаў па руху тавару ад склада да гандлёвага месца», — сказаў намеснік міністра. Плануецца, што хутка тэкст указа паступіць ва ўрад.

### БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ, АЛЕ З ПАДАТКАМ

Тое, што ў новым указе будуць ўлічаны інтарэсы ўсіх зацікаўленых, гаворыць і бізнес-супольнасць. Напрыклад, **старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў Аляксандр КАЛІНІН** заявіў: «Грамадскія арганізацыі прадпрымальнікаў звярнуліся да кіраўніка дзяржавы з просьбай прыняць новае рашэнне аб парадку працы ІП. Хачу адзначыць, што ён падтрымаў пазіцыю беларускага бізнесу. Цяпер ідзе актыўны дыялог з урадам, і ён улічвае інтарэсы бізнесу пры падрыхтоўцы новага ўказа для ІП».

У прыватнасці, іпэшнікам хочацца, каб была адноўлена праца без дакументаў на няпэўны тэрмін з умовай павелічэння падатковай нагрузкі. «Указ №222 прымаўся з разлікам, што нашы партнёры па Мытным саюзе будуць праводзіць узгодненыя дзеянні па рэгуляванні дзейнасці ІП і ўвядзенні тэхрэгламентаў. Аднак ужо ў ЕАЭС мы бачым, што нашы партнёры не прымаюць адэкватных мер, і ў выніку беларускія прадпрымальнікі апынуліся ў самай нявыгаднай сітуацыі», — паскардзіўся Аляксандр Калінін.

Шматбаковы дыялог бізнесу і ўлады пацвярджае і **старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН.** Ён лічыць неабходным, каб новы ўказ дазваляў прадпрымальнікам больш лёгка адаптавацца да эканамічных рэалій: «Важна, каб людзі не засталіся беспрацоўнымі, але ў той жа час бачылі калідоры развіцця бізнесу, што яны будуць запатрабаваныя».

### НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ

Аднак забываць пра тое, што цяпер ужо ўсе павінны працаваць ва ўмовах ЕАЭС, не трэба. І парушальнікаў будуць караць. Толькі да 1 чэрвеня 2015 года парадак прымянення санкцый да парушальнікаў абавязковых патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза будзе такім жа, якім быў да прыняцця Указа ад 9 лютага №48 «Аб мерах па забеспячэнні дзяржаўнага кантролю (нагляду) за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў», паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі. Да ўступлення ў дзеянне Указа №48, да суб'ектаў гаспадарання і службовых асоб будуць прымяняцца меры, прадугледжаныя Указам ад 16 кастрычніка 2009 года №510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», арт.13 Закона «Аб тэхнічным нарміраванні і стандартызацыі» і Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях па артыкулах, якія адносяцца да кампетэнцыі органаў, што ажыццяўляюць дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне стандартызацыі.

«Да 1 чэрвеня бізнес павінен вывучыць Указ №48. Такі адаптацыйны перыяд суб'екты гаспадарання і органы дзяржкіравання атрымалі ў рамках Указа ад 20 лютага 2015 года №90 «Аб прыпыненні дзеяння Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Гэты дакумент прыпыняе да пазначанага тэрміну дзеянне Указа №48», — патлумачылі ў прэс-службе.

Цяпер Дзяржстандартам сумесна з іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржкіравання распрацоўваецца план мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Указа №48.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

## Суседу давярай, але паперку ў рэестры лепш правер

**Для мінімізацыі рызык, якія звязаны з падачай прадаўцамі краін Мытнага саюза фальсіфікаваных дакументаў, што пацвярджаюць адпаведнасць прадукцыі тэхнічным рэгламентам МС, Мінэканомікі Беларусі рэкамендуе прадпрымальнікам звяртацца да Адзінага рэестра выдадзеных сертыфікатаў адпаведнасці і зарэгістраваных дэкларацый аб адпаведнасці Мытнага саюза.**

У прэс-службе Мінэканомікі адзначылі, што адзіны рэестр з'яўляецца афіцыйнай крыніцай інфармацыі аб выдадзеных (зарэгістраваных) сертыфікатах адпаведнасці (дэкларацыях аб адпаведнасці) патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. У яго ўносяцца звесткі пра сертыфікаты адпаведнасці і дэкларацыях аб адпаведнасці, якія змяшчаюць звесткі аб рэгістрацыйным нумары названых дакументаў, іх тэрміны дзеяння, звесткі аб заяўніку на пацвярджэнне адпаведнасці, вытворцу прадукцыі, інфармацыю аб прадукцыі, якая дазваляе яе ідэнтыфікаваць, і інш.

Пры выкарыстанні звестак гэтага адзінага рэестра індывідуальным прадпрымальнікам мэтазгодна праверыць наяўнасць атрыманых ад прадаўца сертыфікатаў адпаведнасці або дэкларацый аб адпаведнасці, а таксама супаставіць інфармацыю, якая пазначана ў атрыманых сертыфікатах або дэкларацыях, са звесткамі ў рэестры, адзначылі ў Мінэканомікі.

Адзіны рэестр, а таксама пакрокавыя інструкцыі па пошуку сертыфікатаў адпаведнасці і дэкларацый аб адпаведнасці ў яго нацыянальных частках (Беларусі, Казахстана і Расіі) размешчаны на сайце Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі пад банерам «Індывідуальнаму прадпрымальніку: аб пацвярджэнні адпаведнасці прадукцыі лёгкай прамысловасці».

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні супрацоўніцы газеты «Звязда» Карпучок Святлане Генадзеўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

# Заробкі бюджэтнікаў і стыпендыі пералічаць

З гэтага месяца павысілася тарыфная стаўка першага разраду

**Паводле пастановы Савета Міністраў № 109 ад 18 лютага 2015-га, тарыфная стаўка цяпер складае 292 тысячы рублёў. Мінулае павышэнне было ў лютым, калі стаўку вызначылі ў памеры 277 тысяч.**

Прынятая мера дазволіць павялічыць заробкі людзей, занятых на дзяржаўных прадпрыемствах (сёння такіх каля 850 тысяч). Заработную плату сваіх супрацоўнікаў у адпаведнасці з новай тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі Адзінай тарыфнай сеткі пералічаць рэспубліканскія органы дзяржаўнага ўпраўлення, мясцовыя выканаўчыя органы, кіраўнікі бюджэтных арганізацый і тых устаноў, што атрымліваюць субсідыі і работнікі якіх прыроўнены па аплаце працы да бюджэтнікаў. Вырастуць таксама дзяржаўныя стыпендыі навучэнцам, даплаты маладым спецыялістам, даплаты за вучоныя ступені. Новае павышэнне стаўкі дазволіць наблізіць узровень заработнай платы бюджэтнікаў да ўзроўню сярэдняга заробку па краіне і забяспечыць заробкі нізкааплатных працоўных кадраў не ніжэй за вызначаны памер мінімальнай заработнай платы. Так, па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, летась дзякуючы прынятым захадам (у тым ліку і павышэнню тарыфнай стаўкі, якое было двойчы) рэальны заробак, які вызначаецца колькасцю набытых спажывецкіх тавараў і паслуг на грошы, што засталіся пасля выплаты падаткаў і абавязковых узносаў, у бюджэтнай сферы павялічыўся ў параўнанні з 2013-м на 2,1 працэнта.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Май на ўвазе

# Хутка пачнецца паляванне на качку

## Канкрэтныя тэрміны вызначаюць карыстальнікі ўгоддзяў

**З другой суботы сакавіка (сёлета гэта 14-га) па другую нядзелю мая (10-га) у краіне будзе дзейнічаць чарговы сезон палявання.**

Здабываць можна будзе крыжанку, чэрнець чырвонагаловую, чэрнець чубатую, чырка-траскунка, чырка-свістунка. Дазваляецца паляванне на самцоў (качараў), якія толькі падселі ці падляцелі да падсадной качкі (качак) ці чучала (чучалаў) у светлы час сутак, акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін, зброевым спосабам з засады толькі са схованкі з падвабліваннем, з дапамогай падсадной качкі (качак) і (ці) чучала (чучал) і вабіка (вабікаў).

— Дазволена выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі, зараджанымі шротам. Для пошуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, выжлаў, спаніэляў, рэтрыверaў, водных сабак, — распавёў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Вадзім Варабей. — Агульная працягласць веснавога сезона палявання на качак не можа перавышаць чатырох тыдняў (28 каляндарных дзён). Канкрэтныя тэрміны веснавога палявання ў гэтым дыяпазоне вызначаюцца загадам ці іншым рашэннем карыстальніка паляўнічых угоддзяў да пачатку сезона палявання.

За парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання можна атрымаць штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй зброі, іншых прылад палявання і прадметаў, якія сталі прыладамі ці сродкам здзяйснення парушэння, ці без канфіскацыі і з пазбаўленнем спецыяльнага права на паляванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Сталічны час

# ЧЫСТАЯ МАНЕТА

**На думку старшыні Мінгарвыканкама Андрэя ШОРЦА, самыя актуальныя пытанні для сталічных улад — вырашэнне праблем з нездавальняючым станам некаторых тэрыторый, а таксама павелічэнне долі безнаяўных разлікаў.**

### ШТРАФЫ МАКСІМАЛЬНЫЯ

На аператыўнай нарадзе ў гарвыканкаме Андрэй Шорац запатрабаваў прымяняць максімальныя штрафы за нездавальняючы санітарны стан тэрыторый.

«Задача санітарнай службы стварыць такія ўмовы, каб людзі разумелі, што лепш утрымліваць тэрыторыю ў парадку і своечасова прыбіраць яе, чым плаціць штрафы. Калі кантралёры за кожнае парушэнне будуць накладваць максімальны штраф, тады гараджане пачнуць разумець, што лепш выконваць пастаўленыя ўмовы», — растлумачыў мэр сталіцы.

Фінансавы рычаг павінен стаць асноўным матывавальным фактарам у вырашэнні гэтых праблем. Паводле слоў **галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача сталіцы Наталлі ЖУКАВАЙ,** за два апошнія тыдні ў Мінску выраслa колькасць тэрыторый з нездавальняючым санітарным станам. Усяму віной надвор'е. У прыватным сектары праблему стварае адсутнасць кантэйнерных пляцовак, якія, магчыма, ёсць сэнс вярнуць. Праблемнай для сталічнай санслужбы з'яўляецца праца з таварыствамі ўласнікаў.

«Сёння тыя штрафы, якія выпісваюць начальнікам таварыстваў, аплачваюць жыхары. У канчатковым выніку на начальнікаў гэты рычаг дзейнічае слаба», — цытуе БЕЛТА галоўнага санітарнага ўрача горада.

### ДЗВЕ КАРТКІ НА АДНАГО ЖЫХАРА

Андрэй Шорац таксама выказаў прапанову аб неабходнасці павышэння прывабнасці безнаяўных разлікаў для насельніцтва.

«Таму мы з усімі зацікаўленымі, у тым ліку з гандлёвымі сеткамі, прадпрыемствамі, якія аказваюць паслугі, павінны прадумаць пытанне аб тым, якім чынам зрабіць безнаяўныя плацяжы больш выгаднымі ў параўнанні з наяўнымі», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама.

У Беларусі ў абарачэнні знаходзіцца 12,3 млн плацежных картак, з іх 4 млн належаць жыхарам Мінска. У сярэднім на аднаго жыхара сталіцы прыпадае па дзве аплатныя карткі. Адным з дзейсных метадаў развіцця сістэмы безнаяўных разлікаў з'яўляецца максімальнае аснашчэнне аб'ектаў гандлю і паслуг аплатнымі тэрміналамі. У 2014 годзе ў сталічных аб'ектах гандлю і сэрвісу было ўстаноўлена больш за 5 тыс. тэрміналаў. Удзельная вага рознічнага таваразвароту, атрыманага ў выніку разліку за тавар з выкарыстаннем банкаўскай карткі, склала 22,2%, што на 3,5% вышэй, чым у цэлым па краіне. Вышэйшая за сярэднегарадскі ўзровень удзельная вага безнаяўных разлікаў у гандлёвых арганізацыях Першамайскага, Савецкага і Цэнтральнага раёнаў горада.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Бывай, валюта!

# У адпачынак — за рублі

**З 1 сакавіка Нацбанк спыніў выдачу індывідуальных дазволаў суб'ектам валютных аперацый на выкарыстанне ў разліках з фізічнымі асобамі замежнай валюты пры ажыццяўленні страхавой і турыстычнай дзейнасці. Гэта прадугледжана пастановай праўлення Нацыянальнага банка №47 ад 3 лютага.**

Цяпер толькі ў беларускіх рублях можна будзе разлічыцца за аўтамабільны бензін усіх марак, дызельнае паліва і звадкаваны газ, а таксама ў аб'ектах рознічнага гандлю на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах з нумарацыяй «М», «М/Е» і ў пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу Беларусі.

Аднак у выпадках змянення або скасавання дагавораў выплачаная кліентам сума вяртаецца яму ў валюце. Па інфармацыі Нацбанка, суб'екты валютных аперацый, якія прынялі да 1 сакавіка 2015 года ад фізічных асоб замежную валюту як аплату тавараў (работ, паслуг), маюць права выкарыстоўваць замежную валюту пасля 1 сакавіка для вяртання гэтым фізічным асобам у выпадках змянення або скасавання заключаных з імі дагавораў. Акрамя гэтага, разлікі па дагаворах страхавання і дагаворах на аказанне турыстычных паслуг, якія былі заключаны ў замежнай валюце і выкананне абавязацельстваў па якіх распачата да 1 сакавіка, ажыццяўляецца ў парадку, які дзейнічаў на дату іх заключэння, да выканання бакамі ўсіх абавязацельстваў па дагаворы.

Норма дзейнічае да 1 студзеня 2017 года.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Тарыфы

# Падаражэлі газ, электрычнасць і цяпло

**Такім чынам у сакавіку праіндэксаваны цэны на прыродны і звадкаваны газ, тарыфы на электрычную і цеплавую энергію (ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне) для насельніцтва. Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў №141 ад 27 лютага 2015 года, якая была апублікавана на Нацыянальным прававым партале. Дакумент уступіў у сілу з 1 сакавіка.**

Кошт прыроднага газу, які выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах, а таксама ў садовых домiках (дачах) членаў садаводчых таварыстваў з усталяванымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу, пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў у ацяпляльны перыяд вызначаны на ўзроўні 623,3 рубля за кубічны метр, у летні перыяд — 2 281,8 рубля. Пры адсутнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў (незалежна ад сезона) кошт кубаметра газу складзе 2 281,8 рубля.

Без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу газу яго кошт пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння або індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага) складзе 18 150 рублёў з аднаго жыхара ў месяц; а пры наяўнасці газавай пліты і газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння) — 52 400 рублёў, пры наяўнасці газавай пліты і адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка — 29 650 рублёў з аднаго жыхара ў месяц.

Павышаны цэны і на звадкаваны газ, які выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах. «Куб» такога паліва з устаноўленымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу газу пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў у ацяпляльны перыяд складзе 9 658,7 рубля, у летні перыяд — 6 084 рублі. Без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу газу пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння або індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага) кошт звадкаванага газу з аднаго жыхара ў месяц ўстаноўлены на ўзроўні 18 150 рублёў, пры наяўнасці газавай пліты і газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння) — 51 600 рублёў, пры наяўнасці газавай пліты (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка) — 24 250 рублёў.

Кошт электраэнергіі ў жылых дамах (кватэрах) з электрычнымі плітамі, па аднаставачным тарыфе цяпер складае 810 рублёў за 1 кВт/г, па дыферэнцыяваным тарыфе — 567,5 рубля ў перыяд мінімальных нагрузак з 22.00 да 17.00 і 1621,4 рубля ў перыяд максімальных нагрузак з 17.00 да 22.00. Тарыф на электраэнергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт устаноўлены на ўзроўні 953,8 рубля за 1 кВт/г у перыяд мінімальных нагрузак з 23.00 да 6.00 і 2861,4 рубля за 1 кВт/г у астатні час сутак.

А ўвогуле электрычнасць, за выключэннем указанай у папярэдніх выпадках, па аднаставачным тарыфе будзе абыходзіцца спажыўцам у памеры 953,8 рубля за 1 кВт/г, па дыферэнцыяваным тарыфе — 667,7 рубля за 1 кВт/г у перыяд мінімальных нагрузак з 22.00 да 17.00 і 1907,6 рубля за 1 кВт/г у перыяд максімальных нагрузак з 17.00 да 22.00.

Тарыф на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з першых дзён вясны вызначаны ў памеры 96 424 рублі за 1 Гкал. Такім чынам, агучаныя тарыфы павялічваюцца прыкладна на 1,2-1,3%.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Ведай нашых!

# Курсант супраць злачынца

**Крымінальныя жахі разыграліся ў клічаўскай вёсцы Дзмітрыеўка. Малодшы сяржант міліцыі Антон Галашчапаў, які яшчэ толькі вучыцца на другім курсе магілёўскага інстытута МУС, якраз адпачываў каля тэлевізара ў бацькоў, калі ў дом пастукалася акрываўленая суседка.**

Перапалоханая жанчына паведаміла, што пасварылася са знаёмым, і ён схапіўся за нож. Нанёс ёй два ўдары, і невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б ахвяра не ўцякла.

Антон аказаў суседцы першую дапамогу, а калі прыехаў нарад міліцыі, прыняў актыўны ўдзел у пошуках злачынцы. Пакуль некалькі міліцыянераў прачэсвалі наваколле, ён з яшчэ адным супрацоўнікам РАУС дзяжурыў на месцы здарэння. Раптам патэнцыйны забойца паказаўся на гарызонце. Антон, апазнаўшы яго, разам з напарнікам кінуліся на машыне наўздагон. Пакуль малодшы сяржант утрымліваў мужчыну, кіроўца надзеў яму наручнікі.

Выкладчыкі ганарацца сваім студэнтам. Як адзначыла вядучы спецыяліст інстытута Наталля Гоманава, Антон прымае актыўны ўдзел у жыцці ВНУ і нават камандуе аддзяленнем. Сам курсант прызнаецца, што ў міліцыю прыйшоў па поклічы сэрца і яшчэ ні разу аб гэтым не пашкадаваў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Энергетыка

# ЧЫСТАЯ АРЫФМЕТЫКА

## Сёлета экспарт электраэнергіі плануюць павялічыць удвая, а яе імпарт — істотна паменшыць

**Мінулы год стаў даволі ўдалым для беларускай энергетыкі, калі галіна ўпершыню спрацавала без дэфіцыту сродкаў і атрымала па сістэме станоўчую рэнтабельнасць у памеры 4%. Пра гэта паведаміў міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК.**

Выпрацоўка электраэнергіі на энергетычных крыніцах Беларусі без уліку блок-станцый летась павялічылася ажно на 10,8% у параўнанні з 2013-м і склала 31,6 млрд кВт/г. Арганізацыі галіны ў 2014 годзе ўстойліва і надзейна забяспечылі спажыўцоў цеплавой і электрычнай энергіяй, прыродным і звадкаваным газам у запатрабаваных аб'ёмах, — адзначыў міністр. — Агульнае спажыванне электраэнергіі ў Беларусі склала 38,04 млрд кВт/г, што на 9% больш, чым у папярэднім годзе.

### Эфект ад мадэрнізацыі — 250 млн долараў штогод

Станоўчыя вынікі айчыннай энергасістэмы былі дасягнуты дзякуючы правядзенню яе маштабнай мадэрнізацыі. Паводле слоў міністра, сёлета завяршаецца другі этап рэфармавання галіны, пачатага яшчэ ў 2006 годзе. Толькі летась спецыялісты ўвялі ў эксплуатацыю новае абсталяванне з магутнасцю больш за 1 тысячу мВт, што прыкладна адпавядае магутнасці аднаго блока будучай БелАЭС. Усяго за апошнія 9 гадоў у развіццё і мадэрнізацыю айчыннай энергасістэмы было ўкладзена 8 млрд долараў. Сёння такія сур'ёзныя інвестыцыі ў мадэрнізацыю пачалі прыносіць краіне прыбытак.

**У Германіі так званы зялёны тарыф аплачваецца насельніцтвам.**

Спецыялісты падлічылі, што ўжо цяпер назапашаны эканамічны эфект за гады аднаўлення энергетычнага абсталявання склаў 650 млн долараў. А сёлета і надалей энергетычная сістэма краіны пачне атрымліваць станоўчы эканамічны эфект ад мадэрнізацыі ў памеры не менш як 250 млн долараў штогод. Такая эфектыўнасць тлумачыцца ўкараненнем менавіта сучасных магутнасцяў. Так, на новых парагазавых блоках удзельны расход умоўнага паліва на выпрацоўку 1 кВт/г складае каля 225 грамаў. Заўважу, што ў энергетыкаў ёсць яшчэ блокі, якія «з'ядаюць» 370 грамаў умоўнага паліва на 1 кВт/г.

### Кампенсуем імпарт экспартам

— Краіна сёлета разлічвае падвоіць экспарт электраэнергіі. Калі ўсё пойдзе так, як разлічваюць энергетыкі, то ў 2015 годзе экспарт электраэнергіі з Беларусі можа скласці 1 млрд кВт/г, у той час як летась мы прадавалі за мяжу каля 500 млн кВт/г, — адзначыў міністр. — Такі рэкордны аб'ём наша дзяржава можа экспартаваць упершыню.

Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, зараз энергетыкі актыўна працуюць над рознымі напрамкамі паставак электраэнергіі за мяжу. Вельмі вялікую цікавасць праяўляюць палякі. Цяпер вырашаюцца чыста тэхнічныя задачы, якія дазволяць пастаўляць электраэнергію ў Польшчу. Зацікаўленасць у закупках беларускай электраэнергіі выказваюць таксама Літва і Латвія.

Разам з тым, Беларусі самой не хапае электраэнергіі. Сёння мы імпартуем увесь неабходны аб'ём з Расіі. Імпартуем і лічым. Таму штогод і зніжаем імпарт электраэнергіі. Так, у 2014 годзе ў параўнанні з 2012-м набытыя за мяжой аб'ёмы знізіліся амаль удвая. У 2012 годзе гэта было 7,9 млрд кВт/г, у 2013-м — 6,7 млрд кВт/г, летась — толькі 3,8 млрд кВт/г.

У пачатку года Мінэнерга паведаміла аб планах пра набыццё сёлета каля 2,8 млрд кВт/г расійскай электраэнергіі, што склала б каля 7% ад запланаванага краінай спажывання. Потым мы свае планы падкарэктавалі і цяпер збіраемся купіць за мяжой толькі 2,5 млрд кВт/г электраэнергіі. Невялікае памяншэнне па імпарце, але прыемна.

Раней краіна набывала электрычнасць і ва Украіне, аднак сёлета ад гэтага напрамку былі вымушаны адмовіцца. «Дакладней, нават не мы адмовіліся, а ўкраінскі бок праінфармаваў нас аб тым, што ў іх няма тэхнічнай магчымасці пастаўляць электраэнергію», — сказаў кіраўнік галіны. Хутчэй за ўсё сёлета беларускія энергетыкі пачнуць самі прадаваць электрычнасць Украіне.

Можаце запытаць: навошта нешта прадаваць, калі сам гэта купляеш? Справа ў гандлі і цэнах. Адзінка электрычнасці, што мы набываем у Расіі ў валюце, штогод толькі таннее. А вось у краіны Еўропы электрычнасць мы прадаём, вядома, даражэй. Уладзімір Патупчык паведаміў, што мы сёлета разлічваем атрымаць за прададзеную за мяжу электраэнергію больш за палову той валюты, якую трацім на імпарт.

У Мінэнерга адзначылі, што Беларусь мае дастатковую колькасць міждзяржаўных сувязяў па лініях электраперадачы 330–750 кВ з энергасістэмамі суседніх дзяржаў (Расіі, Украіны, краін Балтыі), што дазваляе, выходзячы з наяўных балансаў суседніх энергасістэм, вызначаць напрамкі паставак электраэнергіі ў краіну. Асноўны аб'ём электрычнасці выпрацоўваецца ў краіне на ўласных энергакрыніцах.

### Электрычнасць і цяпло будуць толькі даражэць?

Напрамую міністр пра гэта не казаў. Разам з тым ён паведаміў, што за апошнія два гады амаль у два разы быў зніжаны аб'ём перакрыжаванага субсідзіравання па электрычнасці для рэальнага сектара эканомікі. Міністр запэўніў, што і сёлета зніжэнне такога субсідзіравання будзе працягнута за кошт больш рэальнай тарыфнай палітыкі для насельніцтва. А яшчэ кіраўнік галіны паведаміў, што ў Беларусі тарыф на цеплавую энергію для насельніцтва ў 6 разоў меншы, чым нават у Расіі.

Вядома, што рэальны сектар эканомікі такі сацыяльны цяжар перакрыжаванага субсідзіравання пакуль выцягвае. Аднак на агульнай эканамічнай прасторы нашых краін айчынныя вытворцы з гэтай нагрузкай у барацьбе за спажыўцоў пачнуць хутка буксаваць. І зразумела, што распрацоўшчыкі генеральнай лініі развіцця нашай эканомікі гэта разумеюць. Таму трэба чакаць павышэння тарыфаў для насельніцтва па ўсім энергетычным спісе. Як адзначыў Уладзімір Патупчык, цяпер беларускае насельніцтва аплачвае толькі 20% выдаткаў, якія нясе энергетыка па выпрацоўцы цеплавой энергіі. Пры гэтым кампенсуецца толькі 40% кошту газу, што накіроўваюць арганізацыі Мінэнерга насельніцтву. Канкрэтных лічбаў аб магчымым падаражэнні вызначаных пазіцый спецыялісты галіны не называлі, аднак гарызонты такога павышэння мы ўбачылі.

### Зялёная электраэнергія: мінусаў больш, чым плюсоў

Мінэнерга збіраецца навесці парадак у сферы выпрацоўкі электраэнергіі на аднаўляльных крыніцах. У найбліжэйшы час аб'ёмы выпрацоўкі такой электрычнасці плануецца кватаваць такім чынам, каб зрабіць працэс пастаўкі энергіі ў сістэму абсалютна кіраваным. Пры гэтым міністр звярнуў увагу, што падобная схема — не вынаходніцтва Беларусі. «Па такім шляху ўжо пайшла Еўропа, бо выпрацоўка электраэнергіі на аднаўляльных крыніцах прыносіць цэлы шэраг праблем, у тым ліку з рэгуляваннем магутнасці і рэжыму працы энергасістэмы ў цэлым. Гэта няпростая сітуацыя, таму яе разумеюць не ўсе», — прызнаў Уладзімір Патупчык.

**Хутчэй за ўсё сёлета беларускія энергетыкі пачнуць самі прадаваць электрычнасць Украіне.**

Сёння заканадаўствам прадугледжана, што Мінэнерга павінна купляць выпрацаваную электраэнергію на такіх станцыях па тарыфе 41 цэнт за 1 кВт/г, пры тым, што продаж яе спажыўцам ажыццяўляецца па сярэдніх цэнах энергасістэмы, якія ў разы ніжэйшыя. Гэтая розніца кладзецца на плечы энергетыкаў. «А вось, напрыклад, у Германіі так званы зялёны тарыф аплачваецца насельніцтвам», — удакладняе пазіцыю міністэрства Уладзімір Патупчык.

На яго думку, у бюджэце Беларусі сёння няма дадатковых сродкаў, якія можна было б накіраваць на стымуляванне выпрацоўкі зялёнай электраэнергіі. «Цяпер падрыхтаваны пакет дакументаў на гэты конт і прапанаваны на разгляд кіраўніку дзяржавы. Чакаецца, што ў найбліжэйшы час яго зацвердзяць і мы зможам навесці парадак у гэтай галіне», — рэзюмаваў міністр.

### З БелАЭС — усё па плане

Тэрміны ўводу ў эксплуатацыю Беларускай АЭС змяняцца не будуць. Яны вызначаны ўказам кіраўніка дзяржавы і перагляду не падлягаюць, пра што паведаміў Уладзімір Патупчык.

Ажыятаж па гэтым пытанні быў выкліканы тым, што 25 лютага на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу быў ратыфікаваны Пратакол аб унясенні змяненняў у пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі атамнай электрастанцыі ад 15 сакавіка 2011 года. Сам дакумент быў падпісаны ў Маскве летась яшчэ 23 снежня.

Змяненні дазволілі аператыўна абменьвацца інфармацыяй, неабходнай для распрацоўкі праектнай дакументацыі і стварэння сістэмы фізічнай абароны (СФА), а таксама забяспечыць якаснае і своечасовае выкананне работ па стварэнні СФА за кошт дзяржаўнага экспартнага крэдыту Расіі, які выдаткоўваецца для будаўніцтва БелАЭС.

На будаўніцтве нашай АЭС па кантрактах з расійскім бокам летась было асвоена 494,5 млн долараў, што на 5% больш за намечаныя планы, паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства энергетыкі Беларусі Жанна ЗЯНЬКЕВІЧ.** На астравецкай пляцоўцы працавалі над узвядзеннем 68 аб'ектаў, у тым ліку будынкаў рэактара, турбіны і градзірні для першага і другога энергаблокаў АЭС. Зманціравана 40 тысяч тон арматуры і выкладзена 290 тысяч кубаметраў бетону. Усяго з пачатку будаўніцтва зманціравана 32,9% арматуры, выкладзена 31,7% маналітнага бетону. Летась доля ўдзелу беларускіх будаўнічых арганізацый у пабудове атамнай станцыі перавысіла 80%.

«На бягучы год ставіцца задача забяспечыць максімальны ўдзел беларускіх арганізацый у будаўніча-мантажных работах Беларускай АЭС і пастаўках абсталявання і матэрыялаў», — адзначыла Жанна Зянькевіч.

У цэлым сёлета па кантрактах з расійскім бокам на ўзвядзенне станцыі плануецца асвоіць са сродкаў дзяржаўнага экспартнага крэдыту Расійскай Федэрацыі 570 млн долараў.

### Для краіны газ патаннее летам

Мінэнерга Беларусі не выключае магчымасці зніжэння цаны расійскага газу ў ліпені. Уладзімір Патупчык патлумачыў, што менавіта з першых дзён ліпеня, калі сітуацыя на расійскім рынку будзе развівацца такім чынам, як цяпер, цана газу будзе падаць і далей. Ён звярнуў увагу на тое, што ёсць формула, якая вызначана дагаворам беларускага боку з Расіяй. Па ёй уваходная цана газу сёлета ўжо зніжана.

У нашу краіну ў 2015 годзе будзе пастаўлена каля 20 млрд «кубоў» блакітнага паліва — прыкладна столькі ж, колькі і ў 2014-м. Згодна з планамі, закладзенымі ў кантракце, транзіт расійскага газу праз Беларусь сёлета складзе каля 45 млрд кубічных метраў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Форум

# РЫНАК НЕРУХОМАСЦІ — НА НОВУЮ ВЫШЫНЮ

**Днямі спецыялізаваны партал Realt.by абвясціў пра старт нацыянальнай прэміі ў сферы нерухомасці REALT GOLDEN KEY 2015.**

Нагадаю, што ўпершыню гэта маштабнае мерапрыемства было праведзена на тэрыторыі Беларусі летась. Тады ўдзел у экспертным савеце прымаў і аўтар гэтых радкоў. У конкурсе прэміі рынку нерухомасці ў 2014 годзе ўдзельнічала 49 намінантаў, сярод якіх 15 агенцтваў нерухомасці, 25 будаўнічых праектаў і 9 персон. «Мы разлічваем, што сёлета REALT GOLDEN KEY 2015 выклікае яшчэ большую цікавасць з боку гульцоў рынку. У крызісны год робіцца яшчэ больш важным праявіць сябе, павысіць якасць паслуг і прадэманстраваць свае магчымасці і поспехі з большай сілай. Мы заклікаем кампаніі сумеснымі намаганнямі падняць рэйтынг айчыннага рынку нерухомасці на новы ўзровень», — адзначыў **дырэктар партала Realt.by Аляксандр МАРТЫНЕНКА.**

**Старшыня Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** адзначыў, што праведзенае летась мерапрыемства стала першай падзеяй такога грандыёзнага маштабу ў сферы нерухомасці Беларусі. «Удзельнічаць у такім конкурсе не толькі карысна, але і прэстыжна. Дзякуючы шырокаму асвятленню ў прэсе прэмія ўзняла ўзровень рыэлтараў і забудоўшчыкаў у вачах спажыўцоў і канкурэнтаў», — лічыць кіраўнік асацыяцыі.

Падтрымаць старт прэміі REALT GOLDEN KEY 2015 прыехаў вядомы **беларускі асілак Кірыл ШЫМКО** — рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінеса, чалавек, у актыве якога шэраг унікальных дасягненняў. Сумесна з Паўлам Сарокам яны працягнулі цягнік, ссунулі з месца больш чым на 3 метры самалёт Іл-76 вагой 150 тон. А ў Кнігу рэкордаў Гінеса хлопцы трапілі ў 2009 годзе, калі ссунулі на 5 метраў танк «Т-34», вага якога — амаль 31 тона. Перад удзельнікамі канферэнцыі Кірыл сагнуў вялікі сталёвы ключ і падарыў яго арганізатарам прэміі. Таксама ён паабяцаў падарыць такія эксклюзіўныя ключы тым тром кампаніям, якія першымі пададуць online-заяўкі на ўдзел у прэміі.

**У руках Кірыла ШЫМКО нават металічны ключ ператвараецца ў спіральку.**

Пераможцы прэміі ў сферы нерухомасці будуць абвешчаны 18 чэрвеня на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання, якая пройдзе ў рэстаране-клубе «Сядзіба». Традыцыйна вядучымі мерапрыемства стануць Катрын Калацкая і Дзмітрый Кахно. Азнаёміцца з намінацыямі конкурсу і падаць заяўку на ўдзел у прэміі можна на сайце REALT GOLDEN KEY 2015 з 25 лютага па 15 красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ На кантролі

# ЗАПЛАЦІ ПАДАТКІ І...

## ПАРУШАЛЬНІКАМ ЗАКАНАДАЎСТВА «СПАКОЙНА СПАЦЬ» НЕ ДАЗВОЛЯЦЬ

**Кіраўнікі прадпрыемстваў, якія плацяць сваім работнікам вельмі нізкую зарплату альбо маюць па ёй запазычанасць, прыцягваюцца да дэкларавання сваіх даходаў і маёмасці, паведаміла начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гродзенскай вобласці ідзія СЯМАШКА.**

### Прад'явіце дэкларацыю!

Гэтае дэклараванне, як правіла, тычыцца тых суб'ектаў гаспадарання, якія плацяць зарплату «ў канвертах» альбо наогул не адлюстроўваюць яе на рахунках бухгалтарскага ўліку. За такія парушэнні летась да адказнасці прыцягнулі больш чым 30 кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый.

Дэклараванне даходаў і маёмасці актыўна прымяняецца цяпер і ў барацьбе з так званым «шэрым» імпартам. У прыватнасці, ім займаюцца тыя, хто ўвозіць тавары з той жа Польшчы пад выглядам асабістай маёмасці. Сярод іх ёсць даволі забяспечаныя людзі — з добрымі дамамі, аўтамабілямі. Ніхто з гэтай катэгорыі людзей не адмаўляецца ад дзяржаўных сацыяльных паслуг і карыстаецца імі нароўні з законапаслухмянымі падаткаплацельшчыкамі. Але… не плаціць падаткі. А прадукцыя «для асабістага ўжытку» на самай справе потым ідзе на продаж, ствараючы канкурэнцыю добрасумленным прадпрымальнікам, якія маюць дакументы, што пацвярджаюць набыццё тавару, і ў поўным аб'еме разлічваюцца па падатках. Паводле інфармацыі Лідзіі Сямашкі, каля 90 чалавек, якія перасяклі мяжу больш за 100 разоў, прыцягнулі да дэкларавання даходаў і маёмасці і яны заплацілі падаходны падатак. Важна і тое, што хтосьці пасля гэтага, мажліва, вырашыў усё ж легалізаваць свой бізнес, зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік.

У цэлым леташнія кантрольныя мерапрыемствы падатковых органаў Гродзеншчыны дазволілі вывесці з ценявога сектара эканомікі і накіраваць у бюджэт 272,7 мільярда рублёў. Па выніках праверак накладзены арышт на тавары (алкагольную і тытунёвую прадукцыю, нафтапрадукты, аўдыё- і відэатэхніку і інш.) і грашовыя сродкі на 35,2 мільярда рублёў. Судовымі і падатковымі органамі прад'яўлена штрафаў на 2,8 мільярда рублёў.

Не заўсёды, праўда, адказнасць нядобрасумленных падаткаплацельшчыкаў адэкватная ўчыненым парушэнням.

— Мы праверылі камерцыйную фірму, якая займаецца перавозкай пасажыраў з Гродна ў Беласток, і ўстанавілі ўтойванне выручкі на 250 мільёнаў рублёў. Аднак паколькі гэты суб'ект гаспадарання карыстацца спрошчанай сістэмай падаткаабкладання, то сума даналічанага падатку склала ўсяго 10 мільёнаў рублёў. Уявіце розніцу… Зразумела, што трэба рабіць наша заканадаўства больш жорсткім у дачыненні да такіх парушэнняў, — зазначае Лідзія Сямашка.

### Выйсці з «ценю»

Разам з тым, выяўленне і пакаранне парушальнікаў — гэта толькі частка справы. Другая, не менш важная задача — каб яны выходзілі з «ценю», станавіліся на падатковы ўлік і акуратна разлічваліся з бюджэтам. З гэтай мэтай падатковыя інспекцыі актыўна скарыстоўваюць такую форму кантролю, як маніторынг, што дазваляе дамагчыся павелічэння падатковых плацяжоў без прымянення да суб'екта гаспадарання адміністрацыйных спагнанняў. Дзякуючы гэтай рабоце летась 598 юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў дадаткова заплацілі ў бюджэт 45,1 мільярда рублёў. Толькі ў Скідзелі Гродзенскага раёна пасля такой праверкі больш за 20 чалавек адразу ж зарэгістраваліся і сталі плаціць падаткі. Акрамя таго, амаль на чвэрць (на 2776 чалавек) стала больш падаткаплацельшчыкаў за здачу ўнаём жылых памяшканняў.

Калі жаданне працаваць у легальным прававым полі ўсё ж няма (за мінулы год выяўлена каля 550 фактаў незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці) і папярэджанне, што даецца пасля першага парушэння, выхаваўчага эфекту не дае, то трэба быць гатовым да жорсткіх санкцый. У чым ужо пераканаліся, напрыклад, гродзенскія таксісты-нелегалы. Прычым пакаранне не абмяжоўваецца вялікім штрафам. У 2013 годзе ў парушальнікаў эканамічны суд арыштаваў і вярнуў у даход дзяржавы 6 аўтамабіляў, на якіх рабіўся незаконны бізнес, летась — 4.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што з 2015 года заканадаўства яшчэ больш узмацняе кантроль за «нелегаламі». У прыватнасці, раней незаконнага таксіста маглі прыцягнуць да адказнасці толькі пасля так званай кантрольнай закупкі, даказаўшы факт перавозкі. Цяпер жа, калі на транспартным сродку ёсць адпаведныя наклейка альбо плафон, а перавозчык не зарэгістраваны — гэта ўжо парушэнне. Як і, дапусцім, інфармацыя незарэгістраванай асобы з рэкламай нейкіх работ ці паслуг. Цяпер падатковым інспектарам не трэба ўжо даказваць іх выкананне, бо калі ты размясціў такую аб'яву, то ўжо павінен плаціць падаткі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ На слыху

# НЕ ЗАКРЫЮЦЬ, АЛЕ ПРАВЕРАЦЬ

**Для двух беларускіх прадпрыемстваў — «Санта Брэмар» і «Інка-Фуд» — узмоцніцца лабараторны кантроль. Гэтае рашэнне было прынята пасля таго, як Мінсельгасхарч разгледзеў пытанне аб'ектыўнасці прэтэнзій Рассельгаснагляду да якасці іх прадукцыі.**

Раней Федэральная служба па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе Расіі выявіла ў слабасалёнай сёмзе лістэрыю (род бактэрый). Мінсельгасхарч Беларусі абяцаў правесці расследаванне гэтага факта. Пазней Рассельгаснагляд паведаміў пра выяўленне антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы пры маніторынгу прадукцыі «Інка-Фуд».

**Дырэктар дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Мінсельгасхарча Васіль ПІВАВАР** растлумачыў, што рашэння аб закрыцці прадпрыемстваў няма. Яны будуць знаходзіцца ў рэжыме ўзмоцненага лабараторнага кантролю да моманту заканчэння расследавання і ліквідацыі ўсіх магчымых неадпаведнасцяў. Ён таксама ўдакладніў, што як мінімум 10 чарговых партый прадукцыі будуць знаходзіцца пад пільным наглядам спецыялістаў з тым паказчыкам, па якім выяўлены неадпаведнасці па якасці.

«Калі вынікі будуць адмоўнымі і нічога не выявяць, падаецца пакет дакументаў на разгляд камісіі па рэестры, якая перавядзе прадпрыемства з рэжыму ўзмоцненага лабараторнага кантролю ў рэжым без абмежаванняў», — адзначыў Васіль Півавар.

Нагадаем, што асноўнымі напрамкамі дзейнасці беларуска-германскага сумеснага прадпрыемства ТАА «Санта Брэмар» з'яўляюцца перапрацоўка рыбы і морапрадуктаў, аптовы і рознічны гандаль прадуктамі харчавання. Прадпрыемства вырабляе больш за 500 відаў прадукцыі і ажыццяўляе пастаўкі ў краіны СНД, Балтыі, на еўрапейскія і амерыканскія рынкі, Ізраіль, Ліван, Грузію, Новую Зеландыю. Замежнае прадпрыемства ТАА «Інка-Фуд» з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Беларусі мясаперапрацоўчым заводам. Яго прадстаўніцтвы адкрыты ў Мінску, Гродне, Гомелі, Віцебску, а таксама ў Расіі і Украіне.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# ЖЫЛЛЁ СА «ЗНАКАМ УЛАСНАСЦІ»

**Узрасла колькасць зваротаў грамадзян аб парушэннях пры прыватызацыі жылля. Пасля праверкі скаргаў высветлілася, што многія з іх былі абгрунтаванымі.**

— Колькасць адміністрацыйных скаргаў на рашэнні выканкамаў аб прыватызацыі жылля ўзрасла больш як у 6 разоў. І гэта, безумоўна, сведчыць пра арганізацыйныя недахопы ў гэтай дзейнасці, — пракаментавалі карэспандэнту «Звязды» ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

На Віцебшчыне за апошнія два гады прыватызавалі больш за 31 тысячу кватэр, пакояў. У кантрольным ведамстве канстатуюць, што выканкамамі не выконваўся месячны тэрмін разгляду заяў грамадзян аб прыватызацыі жылых памяшканняў у Наваполацку, Аршанскім, Лёзненскім, Глыбоцкім, Гарадоцкім, Полацкім і іншых раёнах. З памылкамі вызначалі плошчу такога жылля…

— У большасці раёнаў рашэнні аб прыватызацыі жылых памяшканняў прымаліся без неабходных дакументаў. Не прымаліся належныя меры па спагнанні пратэрмінаванай запазычанасці па выплаце чарговых узносаў за такое жыллё і скасаванні дагавораў куплі-продажу ў судовым парадку. Таксама не займаліся спагнаннем вызначанай дагаворамі пені за час пратэрміноўкі выплаты чарговага ўнёску. А ўсё гэта цягне за сабой неабгрунтаваныя страты даходнай часткі бюджэту, — дадалі ў камітэце.

Кантралёры зрабілі выснову, што праца ацэначных камісій, створаных пры выканкамах, носіць фармальны характар. Фактычна іх абавязкі выконвае адзін спецыяліст арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Былі і такія «ацэншчыкі», якія не валодаюць неабходнымі ведамі. Дакладнасць кошту прыватызацыі жылых памяшканняў членамі камісій не аналізавалася.

Па выніках кантрольных мерапрыемстваў вынесена 20 пратэстаў на рашэнні аб прыватызацыі жылля, старшыням выканкамаў накіравана 21 прадстаўленне, абвешчана афіцыйнае папярэджанне… Усяго за дапушчаныя парушэнні да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнулі каля 40 службовых асоб.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# «ПРЫЗЯМЛЕННЕ» Ў ШЫПЯНАХ

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Шыпяны-АСК» Смалявіцкага раёна адметнае тым, што тут навука і практыка спалучаюцца канкрэтна і вынікова. «Шыпяны-АСК» — структурнае падраздзяленне навукова-практычнага Цэнтра па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук. Мае статус элітнай гаспадаркі.**

Фота Андрэя МАКСІМАВА.

## Калі на пасаду дырэктара пяць гадоў таму вылучалі 29-гадовага Віталя Казлова, у гэтым была пэўная доля рызыкі

На яе землях культывуюцца перспектыўныя высокаўраджайныя сарты збожжавых, зернебабовых, крупяных культур, аднагадовых і шматгадовых траў, рапсу з гучнымі і прыгожымі назвамі: азімая пшаніца «Сюіта», «Элегія», «Ода», жыта «Пралеска», «Зарніца», яравая пшаніца «Ростань», «Васіліса»… Таму павышаная ўвага і патрабавальнасць да гаспадаркі і яе кіраўніка зразумелая. І, відаць, была пэўная рызыка, калі сюды амаль пяць гадоў назад на пасаду дырэктара вылучылі 29-гадовага Віталя Казлова. Так, за плячыма выпускніка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта быў сямігадовы досвед адміністрацыйнай работы брыгадзірам, намеснікам і нават непрацяглы перыяд кіраўніком сельскай гаспадаркі. Але «Шыпяны-АСК» — асабліваe прадпрыемства. І кадравая памылка магла б дорага абысціся. Аднак выбар аказаўся правільным.

Новы дырэктар і кадры на ключавыя пасады падбіраў адпаведныя: маладых, адукаваных, энергічных, амбіцыёзных. Галоўны заатэхнік Вадзім Касцяневіч — равеснік Казлова. Галоўнаму інжынеру Андрэю Малчанаву — 26, галоўнаму аграному Генадзю Шэршню — 27. На іх фоне ветэранамі выглядаць 31-гадовы галоўны ветэрынарны ўрач Сяргей Роўкадзь і 36-гадовы галоўны эканаміст Андрэй Панамарэнка. Пераважная большасць спецыялістаў сярэдняга звяна — ва ўзросце да 35 гадоў. А сярэдні ўзрост калектыву — крыху больш за 40. Амаль класічныя суадносіны сталых і маладых кадраў. Можна без перабольшвання казаць, што «Шыпяны-АСК» — гаспадарка маладзёжная і паспяховая. Напрыклад, Генадзю Шэршню летась удалося дасягнуць сярэдняй ураджайнасці збожжавых 70 цэнтнераў з гектара.

Натуральна, у Год моладзі ў краіне мы не маглі не закрануць самае хвалюючае для маладых сем'яў пытанне: кватэрнае. Ці псуе яно характары працаўнікоў «Шыпяны-АСК»? Аказваецца, зусім не. Наадварот, з'яўляецца адным з тых трывалых якараў, якія надзейна затрымліваюць маладых людзей у гаспадарцы. Многія з іх пасяліліся на вуліцы Маладзёжнай у аграгарадку Алесіна, дарэчы, адным з лепшых у Смалявіцкім раёне па ўзроўні добраўпарадкавання і забеспячэння сацыяльнымі стандартамі. Штогод у гаспадарцы ўзводзіцца 10 дамоў сядзібнага тыпу з усімі выгодамі. У новыя дамы засяляюцца маладыя спецыялісты, якія маюць патрэбу ў даху над галавой. Фактычна чаргі на жыллё ўжо няма, калі не лічыць тых, хто стаіць на пашырэнне. Сёлета чарговая «дзясятка» будуецца на перспектыву для будучых кадраў жывёлагадоўлі. Важнай падзеяй у Алесіна стала і адкрыццё царквы, пабудаванай на ахвяраванні мясцовага насельніцтва.

Вынікамі мінулага года дырэктар у цэлым задаволены. Усе асноўныя мэты ў земляробстве і жывёлагадоўлі дасягнуты, пастаўленыя летась задачы выкананы, а па асобных паказчыках перавыкананы. Азімай пшаніцы сабралі каля 80 цэнтнераў з гектара. Віталь Казлоў агучыў самыя значныя лічбы. Сярод іх хочацца адзначыць адзін з двух галоўных эканамічных паказчыкаў, па якіх мяркуюць увогуле аб эфектыўнасці развіцця любога прадпрыемства — гэта выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў і паслуг у разліку на аднаго працоўнага. Дык вось, летась у «Шыпяны-АСК» яна склала 485 мільёнаў рублёў. Дарэчы, лепшы ў раёне паказчык. І што ўражвае: за мінулы год у долараным эквіваленце выручка на сярэднестатыстычнага работніка ў «Шыпяны-АСК» узрасла прыкладна на 12–13 тысяч долараў у эквіваленце.

**Штогод у гаспадарцы ўзводзіцца 10 дамоў сядзібнага тыпу з усімі выгодамі. У новае жыллё засяляюцца маладыя спецыялісты, якія маюць патрэбу ў даху над галавой.**

Казлоў — прадстаўнік новага пакалення кіраўнікоў аграпрамысловага комплексу краіны. Ён прагматык, эканаміст, як той казаў, да мозгу касцей, імкнецца пралічыць прыблізныя вынікі гаспадарання на бліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, што сёння зусім няпроста. Пастаянна думае над тым, як захаваць станоўчую дынаміку развіцця, якія ўкараняць інавацыйныя метады ў эканоміку гаспадаркі, як не даць кадрам супакоіцца цяперашнімі здабыткамі. Вось аб чым сёння баліць галава, прызнаецца дырэктар.

Сярэдняя зарплата, напрыклад, галоўных спецыялістаў складае тут да 11 мільёнаў штомесяц, ёсць у іх службовы транспарт, усе забяспечаны жыллём, мабільнай сувяззю. Акрамя таго, ёсць магчымасць праявіць сябе, а значыць, і перспектыва кар'ернага росту. Але галоўнае для ўсіх — эканоміка. Асноўны напрамак дзейнасці — мяса-малочная вытворчасць з развітым раслінаводствам. Надзейны прыбытак дае пабудаваны некалькі гадоў назад, адзіны ў краіне насенны завод, дзе ўкаранёны інавацыйныя тэхналогіі сушкі і дапрацоўкі збожжа. Але трэба ісці далей, развіваць тое, што дае эканамічную выгаду, надзейны прыбытак.

**Леанід ТУГАРЫН.**
*Смалявіцкі раён.*

■ Сацыяльны ракурс

# ЯК УТРЫМАЦЬ КВАЛІФІКАВАНЫЯ КАДРЫ

У галіновым прафсаюзе работнікаў адукацыі лічаць, што без дадатковых асігнаванняў зрабіць гэта немагчыма

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**«Пытанне сацыяльнага статусу работнікаў адукацыі сёння застаецца адным з найбольш вострых. Між іншым, магчымасці галіны ў яго вырашэнні не бязмежныя. Аптымізацыя дае пэўны эфект, але гэтага эфекту ўсё роўна недастаткова для давядзення сярэднямесячнага заробку педагагічных работнікаў да рэгіянальнага і рэспубліканскага паказчыкаў», — паведаміў на сумеснай калегіі Міністэрства адукацыі і кіраўніцтва Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі старшыня Цэнтральнага камітэта Аляксандр БОЙКА.**

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Сярод галін сацыяльнай сферы па ўзроўні сярэдняй заработнай платы адукацыя займае па выніках 2014 года перадапошняе месца (4121,3 тыс. руб., або 67,7% ад сярэдняга заробку ў краіне). У 2011 годзе гэтыя суадносіны былі на ўзроўні 77,3%. Працягваецца зніжэнне тэмпаў росту намінальнай і рэальнай налічанай заработнай платы работнікаў галіны, якое назіраецца з 2011 года. Так, у мінулым годзе тэмп росту намінальнай заработнай платы склаў 119,5%, а рэальнай — 101,2%.

Летась у краіне працягвалася аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі, з-за дэмаграфічных прычын перагледжвалася колькасць работнікаў арганізацый, узмацняўся кваліфікацыйны складнік, а таксама рэгіянальны акцэнт у аплаце працы. Аляксандр Бойка мусіў канстатаваць, што разрыў ва ўзроўні сярэднямесячнага заробку работнікаў сістэмы адукацыі, якія працуюць у розных рэгіёнах, усё больш расце. Напрыклад, па выніках 2014 года сярэднямесячны заробак у Мінску склаў 6107,8 тыс. руб., а ў Брэсцкай вобласці — 4379,2 тыс. руб. **Розніца паміж максімальным і мінімальным рэгіянальным паказчыкам сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў сістэмы адукацыі дасягае ўжо 39,5% (у настаўнікаў — 22%, а ў прафесарска-выкладчыцкага складу — 53,8%).**

## ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ Ў АПЛАЦЕ

— Павелічэнне з 1 верасня надбавак педагагічным работнікам за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый дазволіла павысіць сярэдні заробак настаўнікаў у сярэднім на 18%. Разам з тым нельга не закрануць наступную праблему: прынятыя апошнім часам пастановы ўрада не распаўсюджваюцца на шэраг рэспубліканскіх арганізацый, у тым ліку на ўстановы вышэйшай адукацыі, акадэміі, інстытуты перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, — падкрэсліў Аляксандр Бойка. — Таму склалася істотная дыспрапорцыя ў аплаце за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі: фактычна яна залежыць ад таго, з якога бюджэту фінансуецца ўстанова. Такім чынам, надбаўка за наяўнасць адной і той жа кваліфікацыйнай катэгорыі, напрыклад, у метадыста Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ніжэйшая, чым у метадыста абласнога інстытута развіцця адукацыі. Такая ж розніца ў аплаце за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі будзе ў сацыяльных педагогаў, якія працуюць ва ўстанове вышэйшай адукацыі і ў гімназіі. Нам трэба дабівацца ліквідацыі дыспрапорцыі, як гэта было зроблена ў пачатку года ў дачыненні да педагагічных работнікаў арганізацый аховы здароўя і арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі.

Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза накіраваў у Савет Міністраў зварот, які базуецца на разуменні таго, што без дадатковых асігнаванняў галіна не ў стане ўтрымліваць кваліфікаваныя кадры.

## ЦІ НА КАРЫСЦЬ ЭКАНОМІЯ?

Аляксандр Бойка таксама паведаміў, што ў рамках аптымізацыі колькасці работнікаў дзяржаўных устаноў вышэйшай адукацыі, а таксама ўстаноў, падпарадкаваных міністэрству, арганізацыі маюць сёння сродкі на матэрыяльнае стымуляванне ў рамках кантрактнай формы найму. Прычым аб'ём гэтых сродкаў ужо дастаткова вялікі. Фактычна гэта адзіная мера, рэалізаваная ў дачыненні да работнікаў рэспубліканскіх устаноў. За апошні час аб'ёмы фінансавання на названыя выдаткі істотна павялічыліся.

— Для нас важна, каб яны расходаваліся эфектыўна і ў максімальна поўным аб'ёме. Гэтыя пытанні павінны вырашацца сумесна з прафсаюзнымі камітэтамі. Захады стымулявання для прафесарска-выкладчыцкага складу павінны быць на асаблівым кантролі. І мы будзем гэтай тэме надаваць асаблівую ўвагу ў бягучым годзе, — паабяцаў кіраўнік прафсаюза.

Па інфармацыі, якую агучыў Аляксандр Бойка, летась прафсаюзнымі органамі было разгледжана 26 544 пісьмовыя звароты, 13 662 чалавекі былі прыняты на асабістым прыёме. Па-ранейшаму **найбольшая колькасць зваротаў выклікана пытаннямі звальнення па ініцыятыве наймальніка,** скарачэннем штатаў, заключэннем, падаўжэннем і скасаваннем кантрактаў, пытаннямі аплаты і матэрыяльнага стымулявання працы, працоўных водпускаў і жыллёвага заканадаўства. Істотна выросла колькасць зваротаў па пытаннях работы прафсаюзных органаў і кадраў.

Аналіз работы прававой інспекцыі паказаў, што найбольш тыповыя парушэнні працоўнага заканадаўства выяўлены якраз пры звальненні работнікаў па ініцыятыве наймальнікаў, прымяненні мер дысцыплінарнага спагнання, заключэнні калектыўных дагавораў, аплаце і матэрыяльным стымуляванні працы.

Нягледзячы на захады па працаўладкаванні вызваленых у выніку аптымізацыі работнікаў, за 2014 год, па скарачэнні штатаў былі звольнены 843 работнікі, у тым ліку 345 педагагічных (у 2013 годзе — 640 і 249 работнікаў адпаведна). На 1 студзеня 2015 года ў цэнтрах занятасці насельніцтва стаяць на ўліку як беспрацоўныя 248 былых работнікаў арганізацый адукацыі, у тым ліку 189 педагагічных работнікаў (у 2013 годзе — 217 і 159 адпаведна).

## ЧАРГА НА ЖЫЛЛЁ

У 2014 годзе было пабудавана і прадастаўлена работнікам галіны 1677 кватэр (у горадзе — 1228 і ў сельскай мясцовасці — 449). Для параўнання: у 2013 годзе гэты паказчык складаў 1553 кватэры (1264 і 289), а ў 2012 годзе — 2022 (1709 і 313). Прафесарска-выкладчыцкаму складу і навуковым работнікам у 2014 годзе прапаноўвалася арэнднае жыллё, у тым ліку ў жылым комплексе «Магістр» у Мінску. Тым не менш змяншэнне колькасці работнікаў галіны, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на пачатак 2015 года склала ўсяго 1% у параўнанні з 2014 годам.

Яшчэ адна праблема звязана з новай рэдакцыяй Палажэння аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах. Па словах Аляксандра Бойкі, на 14-дзённым лістку непрацаздольнасці нізкааплатныя работнікі галіны губляюць больш як 200 тысяч рублёў, а маладыя спецыялісты-настаўнікі на дапамозе па цяжарнасці і родах — больш як 9 мільёнаў рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**

**Кантракты заключаны з 80,2% работнікаў установ адукацыі. Колькасць кантрактаў, заключаных з работнікамі на пяць гадоў, складае 43% ад агульнай колькасці заключаных кантрактаў. У 2014 годзе дадатковы заахвочвальны водпуск быў прадугледжаны больш чым у 95% кантрактаў, а павышэнне тарыфнай стаўкі было прапісана больш як у 80% кантрактаў.**

■ Расклад на заўтра

# СКАРАЧЭННЕ ЎНІВЕРСІТЭТАЎ ЦІ... УЗБУЙНЕННЕ?

## Эксперты агучылі сваё бачанне далейшага развіцця вышэйшай школы

**Напрыканцы мінулага тыдня інтэрнэт абляцела «навіна», якая моцна азадачыла не толькі абітурыентаў гэтага года: як сцвярджалі шматлікія інтэрнэт-крыніцы, колькасць ВНУ ў Беларусі плануюць скараціць з 54 да 20. Справа ў тым, што калі ў апошнія гады вышэйшыя навучальныя ўстановы ў нашай краіне і закрываліся, то гэта былі толькі прыватныя ВНУ. А вось колькасць дзяржаўных наадварот расла: каледжы, філіялы і факультэты пераўтвараліся ў інстытуты і ўніверсітэты. (Так, напрыклад, з'явіліся Інстытут пагранічнай службы і Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў.) І тут раптам высвятляецца, што колькасць установ вышэйшай адукацыі можа быць скарочана больш чым удвая!**

Каб супакоіць і абітурыентаў, і студэнтаў, і выкладчыкаў ВНУ Міністэрства адукацыі афіцыйна пракаментавала паведамленне, што ўзбударажыла грамадскую думку.

— У Гродне, на міжнароднай навуковай канферэнцыі «Праблемы і перспектывы інавацыйнага развіцця ўніверсітэцкіх адукацыі і навукі» была прадстаўлена міжнародная практыка аптымізацыі сістэм устаноў вышэйшай адукацыі ў розных краінах свету. Удзел у ёй узялі больш як 200 беларускіх і замежных экспертаў, — паведаміла **прэс-сакратар ведамства Юлія ВАНІНА.** — Узбуйненне ўніверсітэтаў — агульнасусветная тэндэнцыя, характэрная для Еўропы і ЗША ў апошнія 20-30 гадоў. У залежнасці ад спецыфікі нацыянальных сістэм адукацыі гэты працэс паўсюдна працякае па-рознаму. Скажам, у Фінляндыі колькасць ВНУ за некалькі гадоў скарацілася з 20 да 15. У выніку аб'яднання сфарміраваліся новыя ВНУ, закліканыя стаць флагманамі нацыянальнай адукацыі.

Аналагічныя працэсы адбываюцца ў Данii, дзе з 25 універсітэтаў і даследчых цэнтраў было створана 8 універсітэтаў і 3 навукова-даследчыя цэнтры. У Францыі ў выніку зліцця трох ВНУ быў створаны найбуйнейшы ўніверсітэт краіны ў Страсбургу. Акрамя фінансавай эканоміі, на адміністрацыйных выдатках, узбуйненне ВНУ мае і іншую мэту — палепшыць паказчыкі ў міжнародных рэйтынгах.

На канферэнцыі ішла гаворка пра тое, што пасля з'яўлення інтэрнэту ўніверсітэты страцілі манапольную ўладу на веды. У сувязі з гэтым перад ВНУ стаіць маштабная задача па стварэнні новых адукацыйных опцый, якія былі б запатрабаваныя рынкам.

Універсітэты атрымалі вялікую эканамічную свабоду і пачалі пераўтварацца ў магутныя карпарацыі.

Тут працуе наступная рынкавая логіка: чым больш магутны ўніверсітэт, тым большы яго бюджэт, адпаведна, тым больш у яго магчымасцяў для якаснага паляпшэння сваёй дзейнасці. **Агульнасусветная практыка суадносінаў колькасці ўстаноў вышэйшай адукацыі да колькасці насельніцтва складае 1 універсітэт на 0,5 млн -1 млн грамадзян.**

Беларускія навукоўцы агучылі сваё бачанне далейшага развіцця сістэмы ўстаноў вышэйшай адукацыі ў нашай краіне. Пытанне нумар адзін на павестцы дня — павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх ВНУ на міжнародным рынку адукацыйных паслуг і фарміраванне «кропак росту» для ўстойлівага развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі краіны.

Пры распрацоўцы прадстаўленых для абмеркавання прапаноў улічваўся і кадравы аспект узбуйнення. Беларускія эксперты прызналі, што **ўзмацненне жорсткасці патрабаванняў да прафесійнай кампетэнцыі выкладчыкаў непазбежнае.** Глабальная канкурэнцыя будзе толькі нарастаць. Напрыклад, прэстыжныя заходнія ўніверсітэты выставілі на сваіх сайтах лекцыі вядучых навукоўцаў па асноўных адукацыйных праграмах. І беларускім выкладчыкам нельга адставаць у гэтым пытанні ад сваіх замежных калег. Аптымізацыя навучальных планаў, ліквідацыя дубліруючых і няпрофільных спецыяльнасцяў дадуць магчымасць палепшыць кадравы патэнцыял аб'яднанай ВНУ, павысіць якасць адукацыі. А студэнты атрымаюць доступ да больш шырокага спектра адукацыйных паслуг, больш моцнага выкладчыцкага патэнцыялу і лепшай матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Стварэнне буйных універсітэтаў дазволіць вышэйшай адукацыі годна адказаць на выклікі XXI стагоддзя і адпавядаць патрабаванням, што прад'яўляюцца да яго грамадствам і дзяржавай.

— Але гаворка не ішла пра прыняцце ў найбліжэйшы час кіраўніцкага рашэння па аптымізацыі нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі, — падкрэсліла Юлія Ваніна. — Гаворка ішла аб навуковай праблематыцы і выніках навуковага даследавання і мела на мэце выключна навуковую дыскусію. А прыняцце кіраўніцкага рашэння павінна быць абгрунтавана як з пункту гледжання навукі, так і зыходзячы з практыкі, і ўлічваць нацыянальныя асаблівасці сістэмы адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара**

■

■ Паміж жыццём і смерцю

**Калі больш чым тры дзесяцігоддзі таму яе папрасілі прынесці свае фотаздымкі і дакументы ваенных часоў, а потым расказаць пра вайну маладой журналістцы, яна яшчэ не ведала, што стане гераіняй кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар». Адной з тых двухсот, гісторыі-споведзі якіх увайшлі ў твор, і васьмісот, у каго брала інтэрв'ю аўтарка.**

**У яе няма высокіх узнагарод і званняў. Марыя Перавозчыкава была звычайным радавым, адной з таго мільёну жанчын, што па розных прычынах рваліся на фронт, для якіх выбар паміж жыццём і смерцю быў вельмі простым.**

# САЛДАТ У ЗАВУШНІЦАХ

## «Калі знасілі абутак, хадзілі басанож»

— Усе хацелі абараняць Радзіму, і я таксама, — пачынае гутарку Марыя Перавозчыкава.

І гэта нягледзячы на тое, што ў яе, 18-гадовай дзяўчыны, была так званая бронь: працавала на авіяцыйным заводзе № 21 у Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад. — **Аўт.**). Калі аб'явілі вайну, яна, як амаль уся тагачасная моладзь, абівала парогі ваенкаматаў. Але ў 1941-м з жанчын на фронт бралі толькі медыкаў.

Патрэбу ў любых кадрах, ды проста ў людзях, ацанілі толькі потым. І 9 красавіка 1942 года ў Горкім аб'явілі прызыў для жанчын. У адзін дзень на вайну забралі дзве тысячы дзяўчат. Сярод іх была і Марыя Перавозчыкава.

Трапіла ў 384-ты зенітна-артылерыйскі полк, які дыслакаваўся тут жа, у Горкім. Дзяўчат пачалі вучыць страявой падрыхтоўцы, поўзаць папластунску, страляць… «Былі ў тым, у чым прыйшлі: у сукенках, спадніцах, — успамінае жанчына. — Калі знасілі абутак, хадзілі басанож».

Намеснікам камандзіра быў старшы лейтэнант Назаранка. Прыгожы малады афіцэр падабаўся ўсім дзяўчатам. А з іх нехта павінен быў стаць камандзірам аддзялення сувязі. І аднойчы, каб зменшыць канкурэнцыю, адна з дзяўчат паскардзілася лейтэнанту, што Марыя парушае дысцыпліну.

— А я сапраўды была недысцыплінаваная, — гаворыць яна. — Мяне часта ганялі, ды і скідвалі ўсё на мяне. Аднойчы нават хацела скончыць жыццё самагубствам… Выклікаў мяне да сябе старшы лейтэнант і пытае, у чым справа. А я і кажу, што ў мяне з ёй узаемная нелюбоў: да вайны былі закаханыя ў аднаго чалавека. Ён як пачуў гэта, так адразу выгнаў з кабінета. Стаю на пасту, плачу. Старшы лейтэнант убачыў мяне і пытае: «Шчолакава (яе дзявочае прозвішча. — **Аўт.**), што здарылася?» Я апусціла галаву, а ён мне і кажа: «Калі я лаяў камсорга Ніну, яна выйшла ад мяне і спявала, ідучы па калідоры».

## «Радуешся, бо заўтра цябе можа і не быць»

Яна так не магла. І Марыю Шчолакаву перавялі ў Каўроў, буйны чыгуначны вузел, што на лініі Масква — Горкі. Тут, у пражэктарнай роце, праслужыла паўтара года.

— Я была і тэлефаністкай, і кухарам, і на пасту стаяла, — расказвае ветэран вайны. — Больш не было каму. Нас 7 чалавек усяго: Чайка, камандзір; яго памочнік; шафёр, маладзенькі хлопчык; тры зенітчыцы і я. Хто яшчэ? На вуліцы стаяла печка. Я павінна была гатаваць сняданак. Памятаю, назбіраю грыбкоў, памыю ў ручайку, парэжу ў чыгун бульбы, гэтых грыбоў, дабаўлю цыбулі — і за раз сямёра ўсё з'ядзім.

Жылі яны ў зямлі, як краты. «Вясной прынясеш галінку, паставіш — радуешся, бо заўтра цябе можа і не быць, — кажа Марыя Мікалаеўна. — І запамінаеш-запамінаеш… У мяне былі схаваныя завушніцы. Ноччу надзену і сплю з імі».

Аднойчы прыйшла яна ў іх на дзяжурства. «Што гэта за салдат у завушніцах?» — зрабілі ёй заўвагу і загадалі неадкладна зняць.

## Чацвёрты «афіцэр» і другая лэдзі

1943 год. Ужо вызвалілі Арол і Курск. Стварылі новае воінскае злучэнне — 196-ы асобны зенітна-артылерыйскі дывізіён, куды і перадалі іх роту. Марыю Шчолакаву накіравалі на 3-ю батарэю — камандзірам аддзялення сувязі. Абралі намеснікам камсорга часці. І яна, ужо сяржант і другая лэдзі пасля камсорга часці, як яе называлі, разам з іншымі ахоўвала ваенны завод.

— Акрамя таго, трэба было вучыць аддзяленне дзяўчат-сувязістак, — узгадвае жанчына. — Як намеснік камсорга працавала і з маладымі хлопцамі. Некаторым з іх не было нават 17! Такія маладзенькія прыходзілі…

Аднойчы сяржанту Шчолакавай выдзелілі зялёны англійскі шынель. А бацька знаёмай дзяўчыны быў ваенным краўцом. «Яна мне і прапанавала, каб ён з майго шыняля зрабіў афіцэрскі, — расказвае Марыя Мікалаеўна. — Так на вопратцы з'явіліся залатыя гузікі. На нашай батарэі было ўсяго тры афіцэры. Калі аднойчы ў Каўроў прыехала кіраўніцтва, адзін з начальнікаў спытаў: «А хто там у вас за чацвёрты афіцэр ходзіць?» Шынель загадалі тут жа зняць. І толькі намеснік па палітчасці падказаў зрэзаць залатыя гузікі і прышыць зялёныя.

Дзяўчатам неаднойчы казалі, што на вайне патрэбны салдаты і толькі салдаты.

— Калі нас забралі ў армію, коратка падстрыглі, — успамінае ветэран вайны. — Зараз запрашаюць на розныя мерапрыемствы, дзе бачым, як сённяшнія дзяўчаты ў пастаноўках паказваюць нас: прыгожа апранутыя, валасы распушчаныя. Я, калі гэта ўбачыла, плакала. Не было ў нас доўгіх кос! Паглядзіце на фотаздымкі *(паказвае)*: ці ёсць сярод нас хоць адна з распушчанымі валасамі?

— А вусны ці малявалі?

— Да вы што! І блізка не было такога! Толькі ўжо калі ехалі ў Польшчу, пайшлі рабіць завіўкі. Мы ж за мяжу едзем! А дзяўчаты ваенныя, патрэбна выглядаць акуратна.

## Выкрыццё нямецкага шпіёна

Марыя Шчолакава выконвала даручэнні і асобага аддзела. Тут яе ведалі як Каўроўскую. Пад такім псеўданімам яе задачай было даведацца, якія людзі акружаюць батарэю. Аднойчы дзякуючы ёй быў выкрыты буйны нямецкі шпіён.

— Гэта было падчас вызвалення Польшчы, — расказвае яна. — Ехалі туды цэлы месяц: прапускалі на перадавую ваенныя эшалоны. У Польшчы размясціліся ў сядзібе. Ахоўвалі шлюз водаканала, які злучаў Віслу з Одэрам. У сядзібе той працавалі жанчыны. Быў сярод іх і адзін мужчына, які адразу выклікаў у мяне падазрэнне. Падышла да яго аднойчы і пытаю: «А вы чаму на палях працуеце?». Ён і кажа: «Быў у канцлагеры, нас вызвалілі, дык хачу зарабіць грошай». А я ведала, што калі чалавек у канцлагеры ні ў чым не правініўся, яго адразу адпраўлялі на перадавую. Значыць, нешта тут было не тое. Я паведаміла па сувязі. У выніку гэтым «вязнем» аказаўся буйны нямецкі шпіён.

За гэта сяржант была прадстаўлена да ўзнагароды, якую і да сённяшняга дня не атрымала. Затое былі іншыя прызнанні. За падрыхтоўку асабовага складу і актыўную арганізатарскую дзейнасць яшчэ ў вайну яна атрымала грамату Вярхоўнага Савета СССР і грамату ЦК УКЛСМ.

## «Тры разы ў мяне стралялі…»

Перамогу сустрэла ў Польшчы. Яшчэ 8 мая ім пра гэта сказалі палякі. Наступнай раніцай пра радасную навіну даведаліся асабіста. «Стралялі з усяго, з чаго толькі можна было», — успамінае жанчына.

— А днямі раней ідзём па горадзе, а там вуліцы вузенькія, — працягвае яна. — Насустрач ідзе польскі афіцэр і крычыць: «Вайна скончылася…» А потым удакладняе: «Я вас пытаю: вайна скончылася, што афіцэра не вітаеце?» А я і пажартавала: «У якім статуце напісана, што афіцэра трэба вітаць?»

— А вы былі смелай! Не баяліся?

— Тры разы ў мяне стралялі… Нашы. Я абходзіла часць у Каўрове. На версе — часавы: «Стаяць! Хто ідзе?» Я не зразумела, што гэта мне. Раней ніколі ніхто не спыняў. І ён давай паліць. Не трапіў. Другі і трэці разы былі ў Польшчы.

Па словах Марыі Мікалаеўны, вельмі моцна даставалася ім за трафеі. А напрыканцы вайны эшалоны з імі ішлі і ішлі. Адзін вагон быў са скурай. І нашы вайскоўцы ўсё-такі забраліся туды. Скінулі рулон ці два і саскочылі. Рамяні ва ўсіх былі з тканіны, а тут нарабілі ўсім скураныя. Калі гэта ўбачыла начальства, іх пачалі цягаць у асобы аддзел.

— З фронту ехалі эшалонамі, якія фарміравалі на зборным пункце ў Германіі, — дадае жанчына. — Наш рухаўся на горад Горкі. Дарэчы, у гэтым эшалоне адна дзяўчына з батарэі сустрэлася са сваім бацькам.

**Старонка з кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар»** *(першая злева зверху).*

**Мы прыйшлі з вайны без мужоў, трафеяў і без узнагарод…**

На Радзіме Марыя Шчолакава разам з сяброўкай уладкаваліся на Горкаўскі аўтамабільны завод. Сяргей Кішкін адразу адправіў іх у двухтыднёвы аплачваемы водпуск, дапамог з жыллём. Якой жа радасцю было сустрэцца з ім праз шмат гадоў у Мінску, дзе ён, ужо былы дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода, быў старшынёй Саюнаргаса.

Аднойчы знаёмы Марыі Перавозчыкавай глядзеў яе ваенныя фотаздымкі. Маладая, прыгожая яна на іх! «Напэўна, кавалераў шмат было?» — спытаў ён у яе. «Ніякіх кавалераў! Гэтыя кавалеры былі 1927 года нараджэння — юнакі зусім», — адказала яна яму, як і мне зараз. Тым больш, было вельмі крыўдна, калі яе, як і многіх тагачасных дзяўчат, вінавацілі ў легкадумных паводзінах.

**Сённяшнія дзяўчаты ў пастаноўках паказваюць нас: прыгожа апранутыя, валасы распушчаныя. Я, калі гэта ўбачыла, плакала. Не было ў нас доўгіх кос!**

— Калі адразу пасля дэмабілізацыі прыехала да сястры, яна мяне спытала: «Ты не цяжарная?» — расказвае Марыя Мікалаеўна. — Маўляў, вы ж там усе такія. А вось і не ўсе! А стрыечны брат, якога я наведала 9 мая 1946 года, таксама пацікавіўся, дзе маё дзіця. З таго часу я з ім больш ніколі не сустракалася. А калі былі яшчэ на вайне, адной дзяўчыне маці напісала ліст: маўляла, вы такія-сякія. Я не вытрымала і гучна прамовіла: «Мяне будучы муж будзе паважаць, я яму нараджу 10 дзяцей. І раніцай буду ім казаць: «На зарадку станавіцеся!» Словы мае дайшлі да камандзіра і як легенда хадзілі па часці: «Сяржант Шчолакава 10 чалавек дзяцей народзіць!»

Праўда, нарадзіць столькі не атрымалася. З мужам, Канстанцінам Максімавічам, выхавалі аднаго сына, дачакаліся ўнука. Разам пражылі 33 гады. Без яго яна жыве яшчэ больш…

Дарэчы, дзякуючы мужу яна і прыехала ў Беларусь. Ён, супрацоўнік маскоўскага цэнтра «Энергамантаж» па будаўніцтве і аднаўленні электрастанцый, аб'ездзіў амаль увесь Савецкі Саюз, маларазвітыя краіны. Побач з ім заўсёды была яго верная жонка. Так апынуліся і ў Беларусі. Спачатку былі на БелГРЭСе, у Магілёве, у Мінск прыехалі ў 1962 годзе. І засталіся тут назаўсёды.

***

— Якімі сваімі ўзнагародамі найбольш ганарыцеся? — пытаюся я, развітваючыся.

— Ніякімі. Нічога ў мяне няма. Нічога я не атрымала. Як казала мая франтавая сяброўка Вольга, найвышэйшая ўзнагарода — тое, што мы засталіся жывыя. Мы прыйшлі з вайны без мужоў, трафеяў і без узнагарод…

Наконт узнагарод Марыя Перавозчыкава, вядома, прыменшыла. На яе параднай гімнасцёрцы — ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль Жукава, «За перамогу над Германіяй» і іншыя. Толькі самае каштоўнае для яе, ветэрана вайны, — стаяць зараз на сваіх нагах і мець магчымасць расказаць праўду. Праўду, якая не напоўнена гераічнымі эпізодамі і шматлікімі подзвігамі. Праўду, якая тычыцца лёсу звычайнага радавога. Жаночага лёсу.

**Вераніка КАНЮТА. Фота аўтара** ■

*Думкі ўголас*

### Кніга «У вайны не жаночы твар»

Доўгі час аб дзяўчатах на вайне не казалі ні слова. Калі сустракала ваенных дзяўчат, ім паказвала: «Глядзіце, усё ж такі знайшоўся чалавек, які напісаў пра нас!» Раней я шмат ездзіла па санаторыях, лячылася. І заўсёды гэтую кнігу брала з сабой. Не таму, што я ёсць у ёй. Так, я ёсць у гэтай кнізе, але не я адна. І на вайне я была не адна. Нас, дзяўчат, было шмат. Падчас прэзентацыі кнігі выкладчык Інстытута культуры расказваў, як адзін пісьменнік спытаў іншага (не памятаю прозвішчаў): «Калі саюзнікі адкрылі другі фронт: у 1944 або ў 1945 годзе?» На што апошні адказаў: «Другі фронт адкрылі нашы дзяўчаты. У 1942-м».

### Пра што не прынята расказваць…

Мы ехалі на фронт у таварным вагоне. Прыпынак: дзе, колькі — мы ж не ведаем. А трэба было неяк спраўляць патрэбу. Хлопцам што? А як мы? Старшына нам даў тазік. Я і Алексіевіч пра гэта расказвала. А яна напісала, што я вельмі баялася, як бы мяне ў ногі не параніла, прыгожыя ж. Хлопцам, маўляў, што: яны ў штанах ходзяць. Потым на працы мне гавораць: «А ну, пакажы свае ножкі». А я ім і кажу, што не пра тое гаварыла. А пра звычайныя рэчы, пра якія было не прынята расказваць…

70 гадоў 1945-2015 Вялікай Перамогі

## «Сяржант Шчолакава 10 дзяцей народзіць!»

— Афіцэрам не дазвалялі жаніцца з жанчынамі з акупаванай тэрыторыі, — працягвае франтавічка. — Барані Божа! І ў часці, калі бачылі, хто з кім круціў шуры-муры, то аднаго з улюбёных пераводзілі ў іншае месца.

Ігуменскі тракт
№ 8 (109)

■ Духоўнасць

# ПАМЯЦЬ АБ ПРАВЕДНІКУ

## КАБ ЛЮДЗІ АЧЫШЧАЛІ ДУШЫ...

**...Роўна нясе Дзісна свае воды практычна на ўсім сваім шляху. Толькі ў Шаркаўшчыне, там, дзе рака робіць нечаканы паварот, на высокім беразе стаіць Свята-Успенская царква. Яе прыгажосць удала ўпісваецца ў мясцовы пейзаж: блакітная, лёгкая, урачыстая. Падчас веснавой паводкі 2013 года рака разлілася так, што храм апынуўся на востраве. Але набажэнствы не спыняліся: людзі дабіраліся на лодках.**

Месцічы Шаркаўшчыны называюць царкву блакітнай, не толькі праз колер. Яшчэ з прычыны таго, што святыня нібы з блакіту нябёсаў апусцілася на шаркаўшчынскую зямлю, каб людзі маліліся Усявышняму, ачышчалі тут свае душы.

У архівах храм упершыню згадваецца ў 1639 годзе. Драўляны, з простай, але разам з тым адметнай, вытанчанай архітэктурай. У прыходзе было каля 30 вёсак, дзе пражывалі ад 1500 да 2700 праваслаўных вернікаў. Да 1901 года будынак знаходзіўся ў запушчаным стане. Акрамя таго, у ім не маглі змясціцца адначасова ўсе ахвотныя пакланіцца Богу. Наспела неабходнасць будаваць новы. За справу ўзяўся 20-гадовы святар Канстанцін Дзмітрыевіч Жданаў, які атрымаў прыход, замяніўшы свайго бацьку протаіерэя Дзмітрыя. Шматлікія дакументы сведчаць аб руплівасці настаяцеля па зборы сродкаў на будаўніцтва, выбары і зацвярджэнні архітэктурнага праекта. Казалі, што кожная плітка ў падлозе храма ўкладзена яго рукамі.

Царква ўзводзілася з бярвенняў, на высокім каменным падмурку са званіцай на галоўным фасадзе, талакой: дойлідамі, цеслярамі, мулярамі, мастакамі, рэзчыкамі. Адначасова айцец Канстанцін клапаціўся пра ўладкаванне іканастаса, набыццё званоў. Ён асабіста ездзіў у Маскву, хадзіў з крыжам па дамах купцоў, заможных людзей, збіраў сродкі на іканастас. І той быў устаноўлены: прыгожы, аздоблены пазалотай, ён і цяпер знаходзіцца ў царкве. Больш таго, у Маскве на дабрачынныя ахвяраванні зрабілі кіпарысавы трон і ахвяравальнік. А 31 жніўня 1908 года святар перадаў прашэнне архіепіскапу Нікандру, каб той пахадайнічаў перад Галоўным артылерыйскім упраўленнем наконт лому медзі або латуні ад 400 да 500 пудоў на ліццё званоў. «Голас» самага вялікага 120-пудовага звона людзі маглі чуць за 20 кіламетраў. У 1918 годзе бальшавікі знялі яго са званіцы і закапалі ля Дзісны. Пасля прыходу палякаў людзі адкапалі звон, вярнулі на месца. Але ў 1941-м ужо немцы звезлі звон у Германію, а два меншыя схавалі прыхаджане.

13 лістапада 1912 года адбылася доўгачаканая падзея — асвячэнне адноўленай Свята-Успенскай царквы. Нагадаю, што яшчэ да гэтага ў 1901-1902 гадах стараннямі айца Канстанціна на сродкі прыхаджан былі ўзведзены іншыя царкоўныя будынкі: адзін — для святара, другі — для псаломшчыка і прыходскіх патрэбаў.

За гады служэння ў Свята-Успенскім прыходзе святар праявіў сапраўдны пастырскі талент. Быў строгі ў пытаннях праваслаўнай веры. Аднак меў добрае, чуллівае сэрца. Айцец рана аўдавеў і, акрамя сына, у яго на руках засталіся непаўналетнія брат і дзве сястры. Дапамагаў Жданаў і абяздоленым, заснаваў прытулак для бедных, выкладаў Закон Божы ў тутэйшых школах.

29 жніўня 1916 года прыход наведаў Уладыка Ціхан. У асобе айца Канстанціна архіепіскап убачыў пастыра, якому можна даручыць любую адказную справу. У тым жа годзе іерэй Канстанцін быў зацверджаны загадчыкам жаночай другакласнай школы, эвакуіраванай у мястэчка з Беразвечча Глыбоцкага раёна.

Бюст айца Канстанціна будзе ўстаноўлены ў цэнтры Шаркаўшчыны.

У 1919 годзе айца Канстанціна арыштавалі бальшавікі. Але расправіцца са святаром, які карыстаўся вялікай павагай, на месцы пабаяліся. Тым больш што сярод людзей пачаўся збор подпісаў з просьбай вызваліць Жданава. Арыштаванага перавялі ў павятовы горад Дзісну. Адначасова з ім туды прывезлі і яго катаў: Фама Бацвінёнак, Аляксандр Ліпскі і Міхаіл Ваштай. Памяць людская захавала гэтыя імёны. Яшчэ адно сведчанне таго, што нельга схаваць і за цемраю гадоў нікчэмныя чалавечыя справы.

Былі катаванні, былі здзекі. А пасля звар'яцелыя ад гарэлкі выканаўцы «рэвалюцыйнага прысуду» павялі Канстанціна Дзмітрыевіча і святара Спаса-Праабражэнскай царквы (непадалёку ад Шаркаўшчыны — у вёсцы Язна) айца Міхаіла на расстрэл. Па дарозе апошні прапанаваў паспрабаваць уцячы. Але Канстанцін Жданаў адказаў: «Я нікому нічога дрэннага не зрабіў. Што Бог пашле, тое і буду цярпець». Айцец Міхаіл, скарыстаўшы момант, кінуўся ў кусты, яму ўдалося выратавацца. Вернікі дапамаглі бацюшку Міхаілу схавацца, забяспечылі яго вопраткай. Потым ён доўгі час служыў святаром недзе каля Вільні. Дзякуючы яму людзі даведаліся аб перадсмяротных пакутах айца Канстанціна.

Каты прымусілі настаяцеля выкапаць сабе магілу, пасля чаго кінулі яго туды. Ён прасіў іх не браць на душу грэх смяротнага забойства. Аднак у адказ яго сталі біць лапатай ... Пасля забойцы спыталі святара, ці мае ён апошняе жаданне перад смерцю. Той сказаў, што хоча памаліцца. Яму дазволілі. Затым аглушылі ўдарам па галаве і засыпалі зямлёй.

...Між тым прыхаджане не адразу даведаліся пра смерць свайго духоўнага настаўніка і працягвалі збіраць подпісы для яго вызвалення. Марыя Шаблоўская, якая дапамагала яму па гаспадарцы, паехала ў Дзісну — небяспечная па тых часах справа. Але Канстанціна Дзмітрыевіча ўжо не было ў жывых. Жанчына разам з Іванам Атрахімовічам, сваёй сястрой Ганнай Цітовіч і Рыгорам Вішнеўскім адкапалі цела настаяцеля. Было бачна, што айцец Канстанцін пасля таго, як яго закапалі, апрытомнеў і спрабаваў выбрацца з магілы... Пахавалі святара пад алтаром Дзісненскай царквы, што на мясцовых могілках. Там яго астанкі праляжалі амаль 90 гадоў да таго, як іх вярнулі на радзіму.

...А што ж з забойцамі? Лёс Аляксандра Ліпскага невядомы. Фама Бацвінёнак пры панскай Польшчы за ўчыненае злачынства адсядзеў сем гадоў у турме, вярнуўся на Радзіму. Як прыгадвалі сведкі тых падзей, быў акурат дзень Святога Успення, каля царквы сабралася шмат народу. Ідзе ён, у капелюшы, з палачкай. Не згаворваючыся, людзі накінуліся з кулакамі на забойцу. А з Міхаілам Ваштаём гісторыя ўвогуле містычная. Пры савецкай уладзе служыў ён суддзёй, памёр у 1951 годзе. Жонка пажадала, каб пахавалі яго побач з магілай айца Міхаіла Занковіча, святара другой (белай) у Шаркаўшчыне царквы. Жылі яны па-суседску, бывала, што спрачаліся на рэлігійныя тэмы. Удава заявіла: «Яны спрачаліся тут, няхай і там спрачаюцца, а мы ўбачым, чыя праўда». Але адразу пасля пахавання нябожчык амаль кожную ноч стаў з'яўляцца ў сне ўдаве і сваякам, прасіў іх перахаваць яго, казаў, што яму няма там месца, не дае спакою святар. Зімой, калі маразы моцна скавалі зямлю, зрабіць гэта было немагчыма. Людзі раілі ўдаве Лізе пакуль што маліцца, ахвяраваць на царкву. Яна так і рабіла. А калі прыйшла вясна, перахавала мужа на ўскрайку могілак. Як адкрылі труну, то ўбачылі, што цела Ваштая перавернутае тварам уніз...

**Кацярына СОСНА**

# БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

# КАЗЮКІ, ШТО ПАВОЛІ ВЯРТАЮЦЦА

**Святы Казімір, сын польскага караля і вялікага князя літоўскага Казіміра IV Ягелона, нарадзіўся ў 1458 годзе, а памёр у 1484 годзе ў Гародні, маючы ўсяго 26 гадоў. Апошнія некалькі гадоў жыцця ён фактычна кіраваў Вялікім Княствам Літоўскім ад імя бацькі. Быў вельмі набожным, сціплым, але хваравітым. Асабліва шанаваў шлюбную чысціню. Больш за 100 гадоў каталікі Літвы хадайнічалі перад Ватыканам за прызнанне каралевіча святым і нарэшце ў 1602 годзе дамагліся свайго. Хаця і каралеўскага роду, але пазбаўлены пыхі, міласэрны і просты, Казімір вельмі хутка зрабіўся сапраўдным народным героем, заступнікам і дарадчыкам, блізкім і сваім, нібы той сусед па вуліцы, ды і зваць яго пачалі проста і ласкава — Казюк, Казюкас.**

Фэсты ў яго памяць з абавязковымі шумнымі кірмашамі, народнымі гульнямі і забавамі зрабіліся самым галоўным краёвым каталіцкім святам, па якім можна было пазнаць даўнюю Літву, на якой бы мове ні славілі каралевіча — па-літоўску, па-польску ці па-беларуску. У гады савецкага атэізму свята было забаронена, але з 1990-х гадоў адзначаецца зноў, штогод з усё большым размахам. Вядома, самыя людныя, шумныя, самыя сапраўдныя Казюкі адзначаюцца ў Вільні, у сталіцы Літвы. Але і ў іншых гарадах і малых мястэчках, у тым ліку ўжо і па наш бок мяжы, традыцыя пачынае адраджацца. Цалкам натуральна, што пачалося гэтае адраджэнне з Гародні, дзе наш патрон падоўгу жыў і дзе ўласна адышоў у вечнасць у той самы дзень, які пазней зрабіўся Казюкамі, 4 сакавіка 1484 года. Але ўжо пачалі ўспамінаць яго і ў Лідзе, і ў Астраўцы, і ў Мінску...

Ужо даўно акрэсліўся асартымент тых традыцыйных тавараў, што абавязкова мусілі прысутнічаць на «казюковых» кірмашах як у Вільні, так і ў правінцыі. Гэта найперш традыцыйныя вербы, або «пальмы», — маляўнічыя мастацкія кампазіцыі, у якіх выкарыстоўваюцца народныя ўзоры яшчэ дахрысціянскіх часоў, але якія яскрава сведчаць пра набожнасць і працавітасць народу Божага нашых краёў. Казюкі — своеасаблівая рэпетыцыя Вербнай, або Пальмовай, нядзелі. Таксама абавязковыя на Казюках і вырабы з лазы, дрэва, саломкі, кераміка, асабліва розныя цацкі... Усё, што доўгімі зімовымі вечарамі, узяўшы перапынак ад вечнай сялянскай працы, рабілі мясцовыя саматужнікі. Больш маляўнічага кірмашу народных рамёстваў, чым Казюкі, у Літве няма! А калі Бог дасць, дык праз нейкі час падцягнуцца да Вільні і гарадзенскія Казюкі, тут добразычлівая канкурэнцыя не пашкодзіць! Бо здолела ж польская Познань, у якой такіх традыцый ніколі не было, амаль дагнаць Вільню па размаху святаў. Два былыя віленчукі, каб не памерці ад настальгіі па каханай Літве, у 1994 годзе заснавалі Казюкі на цалкам новым месцы. А цяпер там штогод збіраюцца святкаваць ужо дзясяткі тысяч чалавек, прыязджаюць «зоркі» эстрады, пісьменнікі, мастакі, цыркачы, авантурысты, разявакі з Польшчы, Літвы, Беларусі і ўсяго свету! Можа быць, праз паўстагоддзя Казюкі пакрочаць далей і па ўсім свеце, бо дзе ж сёння не жывуць выхадцы з Літвы, Беларусі і Польшчы, як пайшоў у шырокі свет ірландскі дзень Святога Патрыка.

**Абаранкі, незалежна ад таго, дзе іх выпеклі, па традыцыі называюць «смаргонскімі».**

Не пераказаць усіх гульняў і відовішчаў традыцыйных Казюкоў. І, вядома, ёсць у Казюкоў свая ўстойлівая кулінарная традыцыя. Гэта найперш славутыя сэрцы-пернікі, што прынята дарыць у гэты дзень жонкам і асабліва каханым дзяўчатам, у тым ліку і тым, якім да Казюкоў прызнацца ў сваім пачуцці не наважваліся. Бо не ведалі ў нас ніякіх валянцінак, як не ведалі і прыдуманага Кларай Цэткін «міжнароднага жаночага дня», і таму Казюкі замянялі і 14 лютага, і 8 сакавіка. Надпісы на сэрцы — дасціпныя і іранічныя прызнанні ў каханні, як і на тых «валянцінках». А яшчэ на Казюкі абавязкова пякуць абаранкі з заварнога цеста, і прытым прынята развешваць іх на дрэвах, замест яшчэ адсутнага лісця. Абаранкі, незалежна ад таго, дзе іх выпеклі, па традыцыі называюць «смаргонскімі». Калісьці так і было — наша Смаргонь была сталіцай абаранкаў. Цяпер назва тая, на жаль, ужываецца толькі па інерцыі, але жыхары Смаргоні ўжо задумаліся, як ім аднавіць годны старадаўні промысел.

Застаецца толькі пашкадаваць, што беларускія Казюкі яшчэ такія сціплыя і нясмелыя, што ёсць яшчэ ў іх нядобразычліўцы, якія панура касавурацца ў іх бок, як, зрэшты, і ўсяго добрага, вясёлага і самастойнага. Але Казюкі — веснавое свята! Свята надзеі і кахання. Здолее наш добры Казюк растапіць лёд у зімовых сэрцах, вясна і Божая праўда абавязкова перамогуць! Маліся за нас, Казімір каралевіч, за ўвесь Божы люд, за твой Нёман, які можаш ахапіць з неба адным позіркам. Сцеражы гэтую зямлю і раку, што яна, з усімі прытокамі, поіць, ад Святой гары аж да Куршскай касы, ад пачатку да скону часоў.

## ПЕРНІКАВАЕ СЭРЦА

**Складнікі:** *Шклянка мёду (можна штучнага), 2 лыжкі маргарыну або масла, 250 г мукі, разрыхляльнік цеста, спецыі (імбір, кардамон, гваздзікі — найвялікшы сакрэт пернікаў у кожнага свой), 4 лыжкі малака, 1/2 лімона, 1 яйка, соль, мука для падсыпкі, шакаладная або цукровая глазура.*

**Спосаб прыгатавання:** Растапіць мёд і тлушч, астудзіць. Дадаць муку, змяшаную з разрыхляльнікам цеста і спецыямі, выціснуты сок і цэдру лімона, убіць яйка, пасаліць. Старанна размяшаць цеста, пакінуць на ноч у халодным месцы.

На пасыпаным мукой стале раскачаць цеста пластом 1/2 см таўшчынёй і выкраіць вялікае сэрца (можна, нават 2-3). Выпякаць каля 15-20 хвілін на 180 градусах. Затым пакрыць глазурай (пажадана зрабіць надпіс) і паставіць на некалькі хвілін у яшчэ цёплую духоўку.

**Зоя і Алесь Прышывалкі, заснавальнікі штукарскай пякарні-цукерні «ZORNY», кажуць пра пернікавыя сэрцы так: «Святочны Казюковы пернік — гэта каштоўны сімвал нашай культуры. Традыцыя вылучае нас у глабальным свеце з безаблічнай масы. Кожны раз, калі вы дорыце маленькае сэрца каханай дзяўчыне, вы адначасова робіце і нешта большае. Сімвалічна працягваеце жыццё і памяць усіх тых, хто ўсталяваў гэтую традыцыю і пранёс яе праз стагоддзі. А значыць, дорыце кавалак вашага сэрца і ім».**

■ Пакаленне энтузіястаў

# РАКА РАЗЛІЛАСЯ ПАДЧАС СУХМЕНІ

Касцёл у Дрысвятах.

**На гэты раз у маіх руках аказалася каробка, цалкам запоўненая каляровымі негатывамі. Акуратна складзеныя ў асобныя канверцікі, кожны з якіх надпісаны не толькі населеным пунктам, у якім здымаўся аб'ект, але і архітэктурным стылем. Разглядаючы іх, адчувала, што ў рукі трапіў сапраўдны скарб або 3D-карта, якая дае магчымасць перанесціся ў мінулае.**
**На гэтых негатывах — толькі архітэктура: палацы, замкі, віды на гарады. А найбольш сярод іх — сакральнага дойлідства. Нават думка з'явілася, што нашы продкі толькі тым і займаліся, што цэрквы для Бога будавалі. Асабліва ўражвае драўляная архітэктура. Вытанчаныя і ўзнёслыя, як крэмавыя пірожныя, або грувасткія, масіўныя, нібы з самой зямлі выраслі, культавыя пабудовы. Відавочна, што ў беларусаў, якія будавалі іх, былі такія розныя характары, непадобныя адзін на аднаго спосабы размовы з наваколлем.**
**У гэтым свеце не сумна, бо кожны будынак індывідуальны, у яго ўкладзена душа. З Валерыяй Ждановіч — дачкой фатографа, які ўсё гэта зняў, — размова наша пра архітэктуру атрымалася асаблівай. Былі ў ёй і ноткі суму па няспраўджаных ідэалах, і замілаванне роднай Беларуссю. Пачала Валерыя з іх вандроўкі з бацькам па Палессі:**

## «ТРУМ-ТРУМ-ТРУМ» НА «ЗАПАРОЖЦЫ»

«На нашай невялічкай машыне зверху быў багажнік, нагружаны рэчамі, якія могуць спатрэбіцца ў вандроўцы. Бо штосьці набыць у дарозе тады было складана, даводзілася ўсё браць з сабой — ад запалак і посуду да хлеба. Нават пры вялікім жаданні хуткасць, большую за 90 кіламетраў у гадзіну, наша машына не развівала. Аднак мы заязджалі на ёй у самыя неверагодныя мясціны. Запарожац мог пераехаць брод. Дастаткова было высечы пару невялікіх асінак, кінуць іх пад колы — «трум-трум-трум» і ты праехаў. Пасля толькі трэба было прасушыць тармазы, бо туды трапляла вада.

Яскрава памятаю паездку ў вёску Рубель Столінскага раёна. Яна стаіць на беразе ракі Гарынь, што славіцца непрадказальным норавам. Калі ўлетку пачынаюць таяць леднікі ва Украіне, то рака напаўняецца. А разліваецца тады, калі стаіць сухмень: здаецца, няма ніякіх падстаў для паводкі, не ідуць дажджы, а Гарынь выходзіць з берагоў...

Дарога да вёскі была такая, што машына, спускаючыся і заязджаючы ў яміну, хавалася ў ёй з верхам. Выбіралася — і трапляла ў наступную, знікала з далягляду. Кожная яміна магла аказацца апошняй, з якой ты ўжо не выедзеш. І ніякі трактар цябе адтуль не дастане. Пасля даехалі да ручной паромнай пераправы, пераправіліся на другі бераг.

У Рубель прыехалі ў вельмі сухую пару. Аднак галоўная вуліца проста патанала ў вадзе. А пасярод яе стаяў па самы верх утоплены трактар, на яго даху ляжала свіння. І толькі па беражку, ля самага плота, ішла танюткая сцежачка. Па ёй мы і прайшлі праз гэтую вуліцу, шукаючы драўляную царкву XVIII стагоддзя... Яна проста плыла ў паветры, пафарбаваная ў блакітны колер, на фоне блакітнага неба. Стаіш — і гэтая прыгажосць быццам наплывае на цябе. Выйшаў стараста, дазволіў там паздымаць, пачаставаў нейкімі дзівоснымі памідорамі розных гатункаў — тады гэта таксама было рэдкасцю.

Такіх, як гэта, мясцін, мы з татам аб'ездзілі вельмі шмат. Ён вёў запісы сваіх фотаздымкаў. Крыжы ў яго нататках азначалі сакральную архітэктуру. Негатывы ён нумараваў і складаў у асобныя канверты. Такіх нумароў у нас назбіралася каля тысячы — гэта значыць, ён аб'ездзіў і адфатаграфаваў тысячу аб'ектаў. Усё рабілася на энтузіязме, часцей за ўсё за свой кошт.

## «ВЫРАТАВАНЫЯ ДЛЯ ГІСТОРЫІ»

Працуючы разам з архітэктарамі, мастацтвазнаўцамі, бацька паступова вывучыў архітэктурныя стылі, уласным вокам ацэньваючы ўсё, запамінаў. Напрыклад, розныя спосабы ўкладкі дошак, элементы дахаў, упрыгожванні фасадаў — ва ўсім гэтым ён разбіраўся.

Фатаграфаваць інтэр'еры можна было не ўсюды. Калі ў будынку не размясцілі гаспадарчы аб'ект — збожжасховішча, архіў, кінатэатр ці лазню, то можна было прасіць, каб яго адчынілі, увайсці ўнутр і тое-сёе сфатаграфаваць і ўратаваць. Некаторыя з рэчаў, знойдзеных падчас такіх экспедыцый, — цяпер экспанаты музея этнаграфіі пры Акадэміі навук Беларусі. А тады яны валяліся проста на падлозе, у галубіным памёце, у пыле. Гэтыя прадметы імкнуліся здабыць паляўнічыя на іконы і іншыя рэчы, або яны маглі проста загінуць. Помнікі сакральнай скульптуры, што цяпер захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, калісьці таксама былі сабраныя і выратаваныя для гісторыі ў такіх экспедыцыях.

Бацька і яго аднадумцы аб'ездзілі спачатку Палессе і Заходнюю Беларусь, а пасля і ўсход нашай краіны. Зрабілі апісанні аб'ектаў. Сёння па Заходняй Беларусі выходзяць кнігі, што робяцца палякамі па нашых крыніцах. А Усходняя Беларусь і праваслаўныя аб'екты, іх інтэр'еры, алтары, іканапісы, дагэтуль не скаталагізаваныя, не апісаныя і не выдадзеныя. Гэта праца, якую пачалі энтузіясты — гісторыкі этнаграфіі і архітэктуры — у 1960-я гады, яшчэ патрабуе завяршэння.

У нашай сучаснай гарадской архітэктуры мы знаходзім настальгічныя матывы. Бо людзі, якія, як я, нарадзіліся ў хрушчоўках, раслі ў нецікавых з выгляду дамах, стаміліся ад гэтага. Яны будуюць цяпер арыгінальныя комплексы, — вежачкі, аркі, унутраны двор — помесь Мірскага замка і сталінскага ампіру. У такіх збудаваннях бачная настальгія па пэўных феадальных формах.

## «А ШТО Ў НАС?..»

Многія з тых аб'ектаў, што адфатаграфаваў бацька, сёння ўжо жывуць нармальным жыццём. Яны адрэстаўраваныя, многія з іх выконваюць сакральную функцыю. Гэта не параўнаць з тым, што мы засталі ў ранейшыя часы. Думаю, што наша адраджэнне не мела б такой сілы, каб у такіх людзей, як Валянцін Ждановіч, Яўген Кулік, не было жадання ўсё аднавіць, вярнуць людзям.

Усведамленне таго, колькі ў нас архітэктурнай спадчыны, якая яна прыгожая, вяртала людзям чалавечую годнасць. Бо ў нас таксама былі гарады і замкі, прыгожыя палацы і жыццё, якому зайздросцілі бяднейшыя еўрапейскія феадалы. Яны прыязджалі сюды і бачылі прыроду, шырыню, прастору, магчымасці... Гэта як рэчка Нямíга — яна нібыта ёсць, але нібыта яе і няма. Калі ідзе вялікі дождж, адразу збіраецца многа вады і мы разумеем, што тут была рака. І рэльеф падказвае нам, што тут не можа не быць ракі. А калі проста сухмень — яе нібыта не існуе. Тое ж і з нашай гісторыяй, мовай, спадчынай. Такое ўражанне, што кожнае пакаленне кідалася рабіць вялікі рамонт у Беларусі — і ўсе робяць нанова, нішчачы тое, што рабілі папярэднікі...

## «БЕЛАРУСКІ РАМАНТЫЗМ»

Цяпер многія гістарычныя тэмы ўжо добра распрацаваны. А калі я вучылася, перыяд Вялікага Княства Літоўскага гісторыкам не давалі распрацоўваць. Само згадванне ВКЛ магчымае было толькі з адмоўнымі эпітэтамі. Таму падручнік гісторыі, які быў створаны ў 1990-я і якім мы карыстаемся сёння, вяртае школьнікам самасвядомасць, гістарычнае ўяўленне, што было на гэтай зямлі.

У 1950-я гады, калі вучыўся мой тата, такіх ведаў не было. І аднаўленне гісторыі — гэта подзвіг пакалення 1960-х гадоў. Некаторым давялося заплаціць за яго выгнаннем з краіны, паламаным лёсам. Часта гэта была вялікая, нікім не заўважаная праца.

За 20 гадоў незалежнасці, з аднаго боку, былі запоўненыя многія белыя плямы ў нашым мінулым, але з іншага — сфера ўжывання беларускай мовы ўсё больш скарачаецца. І гэтыя працэсы супярэчаць адзін аднаму.

Равеснікаў майго таты, дзяцей вайны, вельмі рана не стала. Можа, таму што недаелі, недаатрымалі некаторых рэчаў у дзяцінстве. Найлепшыя прадстаўнікі пакалення сышлі ва ўзросце 50 з нечым гадоў — Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч і многія іншыя.

Шкада, што мой тата і яго паплечнікі многае не бачылі, прапусцілі, не дажылі. Не ўсе ідэалы, якімі яны кіраваліся, спраўдзіліся. Але беларускі рамантызм усё ж вярнуў воблік нашым сённяшнім гарадам.

Кляштар у Юравічах.

Гародня, Ліда, Навагрудак — гэта перліны прыгажосці.

Турыстычнымі кампаніямі сёння вядзецца вялікая краязнаўчая праца. Яны шмат сіл укладаюць у тое, каб экскурсіі запоўніць гістарычным кантэнтам. Аднак пакуль атрымліваецца так, што з гістарычнай свядомасці мы выбіраем толькі тое, што можам прадаць як турыстычны аб'ект. А ўсё астатняе, яго зерне, існасць, мы выкідаем, як шалупінне. Яно атрымліваецца недаробленым, жыве не поўнасцю, дыхае толькі адным лёгкім. Таму працы ў гэтым кірунку яшчэ шмат».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва сям'і Ждановічаў**

Драўляная царква ў Гомелі.



Ратуша ў Чачэрску.

■ Нефармат

# НЕЗАПЛАНАВАНЫЯ ДЗЕЦІ

На Савецкую пайшла ў сярэдзіне дня з кволай надзеяй развеяць свой дэпрэсіўны настрой. Савецкая — гэта наш своеасаблівы брэсцкі Арбат, пешаходная вуліца. Тут многа кавярняў, крамаў, усялякай навязлівай рэкламы, шыльдаў на лацініцы, але ў пахмурнае надвор'е ўсё гэта выглядае чамусьці цьмяна. Як тыя навагоднія цацкі з анекдота, што блішчаць, ды не радуюць. Думалася, што калі на дварэ плюс дванаццаць, то хочацца сонца, і тады гэтыя размаляваныя вітрыны выглядалі б куды больш прывабна. Уся ў сваіх разважаннях не звярнула ніякай увагі на жанчыну з вялікім пакетам, прайшла міма, і тады яна паклікала. Так бывае са мной: не заўважу чалавека, потым пачуваю сябе няёмка. Але яе шырокая ўсмешка імгненна нейтралізавала замінку. Я пазнала Алену — мы раней працавалі ў адным будынку, ужо даўнавата на пенсіі, з той пары не бачыліся.

— Дачку во замуж аддаю, — паказала яна вачыма на свае аб'ёмныя пакупкі. — У дарогу збіраю. Замест вяселля яны купілі сабе пуцёўку за мяжу. Сваты былі не вельмі задаволеныя, але ж потым змірыліся: дзеці ўжо дарослыя, разумныя, хай самі вырашаюць.

Яна з задавальненнем расказвала пра сваю дачку, і было бачна, як маці ганарыцца малодшай. А здаецца ж нядаўна яна сядзела разгубленая ў маім кабінеце і зусім не ведала, як ёй быць. Яны жылі тады ў інтэрнаце ад фабрыкі мужа. Чакалі кватэру, зрабілі першы ўзнос. Радаваліся, што нарэшце пераедуць у сваё жытло, бо ў інтэрнатным пакоі па сутнасці выгадавалі дваіх дзяцей. Старэйшы быў на сваім хлебе, малодшая заканчвала школу, рабілася прывабнай паненкай. І тут навіна ў сям'і: маці цяжарная. Дачка закаціла амаль што скандал, гаварыла, што ёй сорамна, яе хлопцы дамоў праводзяць, а тут вось такое. Алене ўжо мінула трошкі за сорак, і яна была ледзь не ў роспачы… Потым расказвала, як нечакана падтрымаў яе старэйшы сын, сказаў, што нічога дрэннага не адбылося, а малога ўсе разам выгадуюць. У гэтай сітуацыі бацька сямейства захацеў паказаць, хто ў доме гаспадар, хоць раней маўчаў. Падбадзёрыў жонку: маўляў, мы яшчэ маладыя, усё паспеем. Паступова звыклася з думкай і малодшая. Адным словам, маленькую сустрэлі з радасцю яшчэ ў інтэрнаце. Потым неяк усё склалася. Пераехалі ў новую кватэру. Дзеці стварылі свае сем'і, раз'ехаліся, а меншая расла ды радавала бацькоў. І выросла яна, здаецца, хутчэй за старэйшых. «Не паспелі азірнуцца, — расказвае маці — школу скончыла, потым універсітэт, стала архітэктарам. Калі ўсё будзе добра, яшчэ і ўнукаў паняньчу».

Мы ішлі па вуліцы далей, гаварылі пра незапланаваных дзяцей і згадвалі падобныя выпадкі са сваякамі і знаёмымі. Такіх аказалася нямала. І ўжо я ёй расказала гісторыю, якую пачула даўно ад суседкі па бальнічнай палаце. Мы ў адзін час нараджалі. А яна, вясёлая жыццярадасная медсястра абласной бальніцы, была несумненным лідарам у нашай кампаніі, з веданнем справы камандавала санітаркамі ў аддзяленні. Часам падавалася нават трохі несур'ёзнай, але аднойчы расказала пра сваю сям'ю. Іх у бацькоў было двое. А калі маці зацяжарала трэцім, то вырашыла зрабіць аборт. Пайшла на аперацыю, нават не сказаўшы нічога мужу. І хоць ён сварыўся потым, ды што зробіш. А праз нейкі месяц высветлілася… амаль неверагоднае. У жанчыны была двойня, і адзін плод застаўся. Тэрмін быў даволі вялікі, але яна плакала, вінаваціла медыкаў, прасіла пазбавіць ад дзіцяці: ці мала што можа быць у такой сітуацыі. Тады муж узяў ініцыятыву ў свае рукі, пасадзіў жонку на канапу і спакойна сказаў: «Калі Бог вырашыў пакараць нас непаўнавартасным дзіцем, а мы ад яго пазбавімся, то атрымаем яшчэ большае пакаранне нейкім іншым чынам. Таму хай будзе, як будзе». І нарадзіўся хлопчык, здаровы. Ён адзін з траіх дзяцей атрымаў вышэйшую адукацыю, скончыў медыцынскі інстытут. Акрамя таго, стаў апорай і бацькам, і сваім старэйшым сёстрам. Было бачна, што яна вельмі любіць брата, ганарыцца ім.

…Цяпер многія нараджаюць запланаванае трэцяе дзіця. Ёсць праграмы дзяржаўнай падтрымкі, лягчэй стала набыць жыллё, зараз вось з'явіўся сямейны капітал. Добра, калі і другое, і трэцяе дзіця ў сям'і жаданыя. Але не ўсё і не заўсёды можна спланаваць. І часам трэба даверыцца лёсу: хай будзе, як будзе, як сказаў шмат гадоў таму адзін чалавек.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Псіхалогія для ўсіх

# ЁСЦЬ «ЗБРОЯ» ДЛЯ ВЫЖЫВАННЯ?

**Паняцце інтэлекту для многіх псіхолагаў парадаксальнае. Здаецца, усё відавочна, але разам з тым ёсць і нешта няўлоўнае. Пэўна, інтэлект можна разглядаць як тры асобныя здольнасці — здольнасць да навучання, да абстрактнага мыслення, да адаптацыі і вырашэння задач.**

— У вызначэнні інтэлекту мы часта выкарыстоўваем паняцце здольнасці, — тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Гульнара ГРЫШАЕВА.** — Аднак здольнасць не зводзіцца да ведаў, уменняў і навыкаў, хоць і забяспечвае іх хуткае набыццё, замацаванне, эфектыўнае выкарыстанне на практыцы. Для развіцця здольнасцяў патрэбны нейкі падмурак, задаткі. Пра што тут ідзе размова? Па-першае, пра анатама-фізіялагічныя перадумовы — тып нервовай сістэмы, целасклад, асаблівасці органаў пачуццяў, фізічную моц і іншае. Задаткі вызначаюць прыродную аснову індывідуальных адрозненняў паміж людзьмі і могуць перадавацца ў спадчыну. На аснове адных і тых жа задаткаў могуць развівацца розныя здольнасці, напрыклад, добры слых неабходны і для паспяховых заняткаў музыкай, і ў рабоце гідраакустыка. Задаткі — гэта аснова, а вось тое, у якой ступені разаўюцца нашы здольнасці, залежыць ад умоў індывідуальнага развіцця…

## Ці атрымліваем спадчыну?

Прырода чалавечых здольнасцяў дагэтуль выклікае гарачыя спрэчкі. На карысць спадчыннай прыроды здольнасцяў сведчаць дынастыі артыстаў, музыкантаў, урачоў. Аднак, хутчэй за ўсё, у большасці выпадкаў варта гаварыць не столькі пра біялагічную, колькі пра сацыяльную спадчыннасць — дзіця ідзе па слядах бацькоў яшчэ і таму, што з дзяцінства даведалася пра іх прафесію і палюбіла яе. Прадстаўнікі іншага меркавання лічаць, што асаблівасці псіхікі цалкам вызначаюцца якасцю выхавання і навучання. Маўляў, калі дзеці самых адсталых і прымітыўных плямёнаў атрымлівалі адукацыю, то нічым не адрозніваліся ад адукаваных еўрапейцаў.

**Наша развіццё заключаецца ў *актыўнай* дзейнасці — *актыўным* раскрыцці нашых здольнасцяў, самаразвіцці, самаўдасканаленні, імкненні да поспеху!**

У той жа час сацыяльная ізаляцыя з дэфіцытам стасункаў («дзеці-маўглі») даказвае немагчымасць уласна чалавечага развіцця па-за грамадствам.

## Інтэлект — гэта…

…інтэгратыўная псіхічная функцыя, якая ўключае здольнасць да пазнання, узровень ведаў і здольнасць іх выкарыстоўваць.

…мысленне ў дзеянні.

…здольнасць да адаптацыі псіхікі, «зброя» для выжывання індывіда.

…спалучэнне генетычных фактараў, уплыву асяроддзя, выхавання і навучання.

…універсальная псіхічная здольнасць, генетычна абумоўленая вартасць нервовай сістэмы перапрацоўваць інфармацыю з пэўнай хуткасцю і дакладнасцю.

— Амерыканскі псіхолаг Давід Векслер, які стварыў у 1939 годзе шкалу інтэлекту для дарослых, лічыў, што «інтэлект — глабальная здольнасць разумна дзейнічаць, рацыянальна разважаць і добра спраўляцца з жыццёвымі абставінамі», іншымі словамі, паспяхова мерацца сіламі з навакольным светам, — дадае спадарыня Грышаева. — Словам, інтэлект — гэта здольнасць чалавека быць індывідуальна адэкватным розным выклікам, «майстэрства» адказваць на гэтыя выклікі.

## Аднолькавае і асабістае

Наша індывідуальнасць вызначаецца нашымі ўнікальнымі паняццямі аб свеце. Фарміруюцца апошнія ў выніку паўсядзённага вопыту. Парадак жа фарміравання генетычна зададзены і аднолькавы для ўсіх людзей. Але тое, як канкрэтны чалавек выкарыстоўвае гэтыя паняцці, — яго асабісты выбар. Кожны чалавек у сваім развіцці праходзіць тры этапы інтэлектуальнага развіцця:

а) эмацыянальны — да 7 гадоў.

Інтэлект практычна не развіты.

б) сацыяльны — 7–16 гадоў.

Інтэлект развіты добра, але выкарыстоўваецца толькі пры неабходнасці.

в) інтэлектуальны — пасля 16 гадоў.

Інтэлект выкарыстоўваецца для самакіравання, а значыць, можа і самаўдасканальвацца.

Для інтэлекту патрабуецца спалучэнне многіх фактараў, а таму інтэлектуальнае развіццё часта затрымліваецца і мы можам назіраць дарослых з інтэлектам дзіцяці.

Розныя ўзроўні інтэлектуальнага развіцця можна абазначыць так:

дзікун — абывацель — асоба.

Дзікун — сінонім неадукаванага чалавека, не знаёмага з умоўнасцямі цывілізацыі.

Абывацель — звычайны чалавек, які трымаецца таго ладу жыцця, што адабрае соцыум.

Асоба — чалавек актыўных дзеянняў, той, хто не пасуе перад цяжкасцямі («моцная асоба»).

Цікава, што мысленне дзяцей прадстаўнікоў першабытных плямёнаў, алкаголікаў і наркаманаў у многім супадае. Тлумачыцца гэта тым, што ў дзяцей інтэлект яшчэ не развіты, у сапраўдных дзікуноў ён не развіваецца ў выніку іх культуры выхавання, а ў алкаголікаў і наркаманаў інтэлект… проста вытраўлены. Таму слова «дзікун» аб'ядноўвае прадстаўнікоў усіх гэтых груп.

## Захаваць і развіць

Наўрад ці знойдзецца чалавек, які прызнаецца, што ў яго недастаткова развіты інтэлект. Многія імкнуцца калі ўжо не развіць інтэлект, то хоць бы захаваць яго на доўгія гады. І такое магчыма.

1. Пастаянна павышайце сваю дасведчанасць: цікаўцеся, назірайце. Між іншым, чалавек таленавіты ў нейкай галіне, суперпрафесіянал, які разумее і ўмее вельмі многае, можа быць абсалютна не дасведчаным у іншых агульнавядомых і важных рэчах. Тым не менш, усе будуць лічыць яго інтэлектуалам. Прыгадаць хоць бы Шэрлака Холмса, які не ведаў, што Зямля варочаецца вакол Сонца.

Мы проста абавязаны пашыраць сваю дасведчанасць, цікавіцца рознымі галінамі жыцця і дзейнасці, калі жадаем, каб наш розум не спыняўся ў сваім развіцці і мы былі людзьмі з высокім узроўнем інтэлекту.

2. Максімальна задзейнічайце памяць. Запамінайце новыя словы, вучыце прыгожыя вершы, вывучайце замежныя мовы.

3. Нагружайце разумовыя працэсы. Аналізуйце, параўноўвайце, абагульняйце інфармацыю, устанаўлівайце прычынна-выніковыя сувязі і праводзьце аналогіі.

4. Будзьце адкрытымі да ўспрымання новых тэхналогій. Цікаўцеся сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, вывучайце магчымасці інтэрнэту і знаходзьце спосабы рэалізаваць свае здольнасці з дапамогай «павуцінння».

5. Дарыце сабе новыя адчуванні. Плавайце, вандруйце, гуляйце, каштуйце новыя стравы.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Разбурэнне стэрэатыпаў

# РАЗМАЎЛЯЦЬ СВАБОДНА… МОЖНА

**Прэзентацыя прамоўніцкага Клуба для людзей з заіканнем «Я размаўляю свабодна!» адбудзецца 14 сакавіка ў Мінску на базе валанцёрскага цэнтра «БелАЮ» (пр. Машэрава, 25-241). Дзейнасць клуба арыентавана на людзей, якія маюць праблемы з камунікацыяй. На мерапрыемства запрашаюцца людзі з заіканнем, спецыялісты, што працуюць з людзьмі з асаблівасцю маўлення, а таксама ўсе зацікаўленыя.**

Клуб «Я размаўляю свабодна!» збіраецца змагацца са стэрэатыпамі, якія сфармаваліся ў дачыненні да людзей, што маюць праблемы з маўленнем.

Ініцыятар стварэння прамоўніцкага клуба відэарэжысёр Дзяніс Сотнікаў расказаў, што ідэю падгледзеў у заходніх калег, якія паспяхова практыкуюць такога кшталту сустрэчы:

— Як прыйшоў да гэтага? Я стаў на сцежку прыняцця сябе, а таксама ўсвядоміў, што, заікаючыся, я стрымліваю непрыемныя мне пачуцці і эмоцыі. Пастаянныя выступленні ў нашым клубе і на іншых пляцоўках дазволілі мне даведацца шмат новага пра сябе і зразумець, што маё заіканне з'яўляецца сістэмай паводзінаў, ушытай у мае асобасныя характарыстыкі і светапогляд. Клуб дапамагае мне і іншым ствараць новую сістэму, якая будзе, як аправа, падтрымліваць алмаз лёгкай і свабоднай гаворкі.

Падчас прэзентацыі, што ладзіць клуб «Я размаўляю свабодна!», можна будзе даведацца пра новы падыход у рабоце па развіцці камунікатыўных навыкаў сярод людзей з заіканнем, азнаёміцца з міжнароднай практыкай дзейнасці такіх арганізацый («Speak free» і «Toasts-Masters»), пагутарыць з камандай лідараў і атрымаць адказы на пытанні, якія цікавяць.

Па выніках прэзентацыі зацікаўленыя ўдзельнікі змогуць прыняць удзел у іншых мерапрыемствах клуба, у тым ліку паспрабаваць сябе ў ролі вядучага, прамоўцы, падзяліцца сваім вопытам збаўлення ад стэрэатыпаў і (або) ад заікання.

Для ўдзелу ў мерапрыемстве трэба накіраваць заяўку ў адвольнай форме не пазней за 10 сакавіка на адрас: denis-474747@tut.by. Дадатковую інфармацыю пра клуб «Я размаўляю свабодна!» можна знайсці на старонцы ў інтэрнэце vk.com/i_speak_free.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Факт

# ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ — ПА «СКАЙПЕ»

**Новыя формы работы — прафілактычныя гутаркі са школьнікамі з дапамогай інтэрнэт-злучэння — пачалі практыкаваць інспектары ДАІ ў Партызанскім раёне Мінска.**

Зносіны па «Скайпе» даступныя і простыя ў выкарыстанні. З дапамогай гэтай праграмы можна вывучаць розныя прадметы, не выходзячы з дома. Такі варыянт навучання карыстаецца папулярнасцю ў сферы адукацыі, таму супрацоўнікі аддзела ДАІ Партызанскага РУУС Мінска вырашылі таксама выкарыстоўваць найноўшыя тэхналогіі і практыку правядзення анлайн-урокаў.

— З дапамогай інтэрнэт-злучэння дзяржаўтаінспэктары ў любы час могуць выйсці на сувязь з адміністрацыяй навучальнай установы або з вучнямі і правесці прафілактычныя мерапрыемствы, — патлумачыла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — А школьнікі, у сваю чаргу, могуць задаць міліцыянерам усе пытанні, якія іх хвалююць.

Падобны спосаб зносін з супрацоўнікамі дарожнай міліцыі ўжо больш за паўгода выкарыстоўвае каманда юных інспектараў руху Партызанскага раёна сталіцы.

Вядома, ён не заменіць прамога кантакту міліцыянераў са школьнікамі. Таму інспектары ДАІ будуць і далей наведваць навучальныя ўстановы. Аднак новая форма правядзення заняткаў дае магчымасць педагогам у пагонах часцей кантактаваць са сваімі вучнямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Жывіце доўга!

# І ПОМНІК Я САБЕ ЎЗВЯДУ

**Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў пры жыцці заказаць сабе помнік, праўда, надмагільны. Аказваецца, у наш час зрабіць такое магчыма. Нават прапаноўваюць сезонныя зніжкі і дысконтныя праграмы.**

## РЭПЕТЫЦЫЯ ПАМІНАК

Усе мы калісьці памром — гэта факт, дык чаму б не паклапаціцца аб належных провадах у іншы свет пры жыцці? Так, сумна, не хочацца, а што ж зробіш? Бо, як сказаў герой камедыі «33»: «Усе мы госці на гэтай планеце...»

А колькі, на мой погляд, цудоўных, усім вядомых фільмаў знялі па гэтай тэме. У прыватнасці, мне яшчэ ў дзяцінстве спадабалася кінастужка «Не горюй». У тым фільме ўрач, якому засталося жыць вельмі мала, арганізаваў пры жыцці памінкі. Патэнцыйны нябожчык, пакуль сябры чакалі яго за сталом, выбіраў труну па колеры... Майстар па яго ж просьбе прынёс у двор дзве труны: чорную і чырвоную. І смех і грэх!

Пры гэтым, безумоўна, тэма смерці, пахаванняў вельмі інтымная. Таму пастараюся асабліва не жартаваць.

Колькі разоў прысутнічаў на падрыхтоўках да пахавання, дык адна з галоўных праблем для сваякоў — дзе ўзяць «нармальны» здымак нябожчыка? Часта робяць павялічаную копію фатаграфіі з пашпарта. Але выглядае такое фота неяк «афіцыйна». А калі яно даўно ўжо не адпавядае твару?.. Вырашыў, што схаджу ў салон.

Ну, літаральна як у Ільфа і Пятрова, у Віцебску так многа пахавальных кантор, што здаецца, людзі толькі і нараджаюцца, каб памерці.

Па дарозе хвілін за дваццаць налічыў некалькі прапаноў аб устаноўцы помнікаў. Патэлефанаваў у фірмы, каб зрабіць заказ. Многія арганізацыі абслугоўваюць толькі па факце, таму мяне палічылі чалавекам, які «не сябруе з галавой». А прасунутыя прадпрыемствы наадварот: не толькі вырабляюць, але і захоўваюць помнікі.

— Так, можам вам зрабіць помнік. Вы не жартуеце? Памяць у найбліжэйшы час не збіраецеся? Ну... Без праблем. Жывіце доўга! Думаем, на складзе месца будзе. Не, дадатковую плату за кожны год захоўвання помніка не бяром. Мы на рынку рытуальных паслуг ужо больш за 10 гадоў. І, паверце, ніхто на нас не скардзіўся. Робім помнікі, яны знаходзяцца на нашым складзе. Вам які, з якога матэрыялу? — пытала прыветлівая дзяўчына. Пасля размовы з такой хочацца жыць мінімум гадоў 100.

Яшчэ ў адной фірме мне прапанавалі сэканоміць.

— Вы можаце набыць у нашым выставачным павільёне ўжо гатовы помнік са зніжкай. Нам толькі застанецца нанесці гравіроўку партрэта і прозвішча, што значна паскорыць тэрмін вырабу помніка. Не спяшаецеся памяць? Так, пры жыцці рэдка, але здараецца, заказваюць помнікі. Але толькі пенсіянеры, каб дзеці і ўнукі не траціліся. Аднойчы і труну заказалі. Ведаю, той чалавек яшчэ жывы, — паведаміла дыспетчар, якая займаецца прыёмам заказаў. Дадала, што і расіяне прыязджаюць па помнікі, бо якасць добрая і цана вельмі прывабная.

А яшчэ больш здзівілі фірмы, якія праводзяць рэкламныя акцыі і робяць сезонныя зніжкі на прадукцыю.



Газоннае пахаванне.



Эксклюзіўны помнік коштам каля 50 мільёнаў рублёў.

## І ЖАЛОБНУЮ ПРАМОВУ НАПІШУЦЬ

Толькі ў адной віцебскай фірме мне паабяцалі, што возьмуцца арганізаваць маё пахаванне ў мінскім крэматорыі. Толькі дагавор трэба падпісаць. Дарэчы, у наступным годзе сталічнаму крэматорыю споўніцца 30 гадоў. Аналагічных устаноў у краіне пакуль што няма. А чаму? Упэўнены, што ў абласных цэнтрах паслугі крэматорыя будуць запатрабаваныя. Напрыклад, сямейныя склепы. Як пахаваць чалавека, калі ён хацеў побач з жонкай, бацькамі, а месца па суседстве з імі няма? А вось у крэматорыі — калі ласка. І гэта не мае разважанні, а знаёмага судова-медыцынскага эксперта.

На жаль, не займаюцца ў правінцыі, у адрозненне ад Мінска, і так званымі газоннымі пахаваннямі. Як гэта выглядае? Ніякіх агароджаў, лавак ля могілак... Усё, як у амерыканскіх фільмах. Чамусьці не прыжыліся ў Віцебску паслугі рытуальных агентаў, якія самі ўсё зробяць за сваякоў. Прафесіяналы лічаць гэта жаданнем жывых сэканоміць на памерлых.

— У дзень пахавання вашага блізкага чалавека прафесіянал дапаможа вам годна арганізаваць і правесці памінальны стол. Ён скаардынуе дзеянні і прамовы сяброў і блізкіх нябожчыка, аформіць фонавай журботнай музыкай час знаходжання за памінальным сталом, агучыць значныя вехі біяграфіі вашага блізкага, яго заслугі (па вашым жаданні), тактоўна і своечасова дапаможа завяршыць цырымонію памінання, дапаможа скласці жалобную прамову для развітання з нябожчыкам, — паведамілі ў адной з мінскіх фірмаў. І падкрэслілі, што вядучы грамадзянскай паніхіды — спецыяліст, які мае вышэйшую культурна-асветніцкую і педагагічную адукацыю (скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры).

Здзівіўся, калі мне расказалі пра беларускі часопіс «Некрополь», у якім можна азнаёміцца з навінкамі «галіны». Традыцыйнымі сталі і спецыялізаваныя выставы.

Дарэчы, ніхто з маіх суразмоўцаў не прыпомніў, каб заказчыкі прасілі зрабіць надпіс на беларускай мове. А вось на грузінскай, армянскай і іншых — здараецца. Для майстроў такія заказы — «галаўны боль», бо цяжка паўтарыць контуры невядомых рускамоўнаму чалавеку літар.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

**Некаторыя рэкламныя «перлы» па тэме выраб помнікаў і аказанні рытуальных паслуг міжвольна выклікаюць усмешку**

*Напрыклад: «Калі б мог нябожчык, падзякаваў бы вам за тое, што вы звярнуліся да нас».*

*«Мы не будзем заваблівать вас нерэальнымі цэнамі, мы проста запросім вас да нас у офіс і прадэманструем якасць нашай працы».*

*«Пакупнікам прапануецца скарыстацца нашай дысконтнай праграмай. Выгадныя цэны на прапанаваную прадукцыю ў Віцебску».*

На сайце рытуальных паслуг убачыў у рубрыцы «Некралогі» прапановы наступных надпісаў на вянках і помніках: «Мы жадаем табе ўдачы ў тым невядомым і новым свеце. Каб не было табе самотна, каб анёлы не адыходзілі». А вось яшчэ: «Даруй, што нам пад небам зорным да тваёй пліты насіць кветкі». І яшчэ: «Даруй, што нам засталося паветра, якім не надыхаўся (лася) ты».

Наконт кошту помнікаў. Самы танны ў Віцебску — усяго каля 700 тысяч рублёў, а дарагі — звыш 20 мільёнаў рублёў. Асабіста мне падабаецца эксклюзіўны помнік, якія прапаноўвае мінская фірма. Ён каштуе каля 50 мільёнаў рублёў.


**ОАО «Барановичский молочный комбинат»,**
**расположенное по адресу:** г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 51, уведомляет акционеров о том, что **31 марта 2015 года в 14-00** состоится

**ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и утверждение основных направлений деятельности Общества на 2015 год.
*(докладчик – директор общества Ракуть В.И.).*
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в 2014 году.
*(докладчик – председатель наблюдательного совета Кривченя А.М.).*
3. Отчет ревизионной комиссии Общества о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.
*(докладчик – председатель ревизионной комиссии общества Гордей Е.В .).*
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2014 год.
*(докладчик – главный бухгалтер общества Козлова Л.Е.).*
5. Утверждение распределения чистой прибыли Общества за 2014 год и направлений использования чистой прибыли Общества на 2015 год .
*(докладчик – главный бухгалтер общества Козлова Л.Е.).*
6. О выплате дивидендов за 2014 год и периодичность их выплаты в 2015 г.
*(докладчик – главный бухгалтер общества Козлова Л.Е.).*
7. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
*(докладчик – вед. юрисконсульт ОАО Тимошенко В.Ю.).*
8. Определение размера вознаграждений для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
*(докладчик – вед. юрисконсульт ОАО Тимошенко В.Ю.).*
9. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
*(докладчик – вед. юрисконсульт ОАО Тимошенко В.Ю.).*

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 24.03.2015 года с 8.00 до 17.00 *(перерыв с 12.00 до 13.00)* по месту нахождения Общества, а в день проведения собрания – в помещении его проведения.

Регистрация участников собрания состоится в день и по месту его проведения с 13.30 до 14.00 по предъявлению документа, удостоверяющего личность акционера, доверенности, зарегистрированной в установленном порядке – для представителя акционера (акционеров), а так же документа, подтверждающего полномочия – для руководителей юридических лиц – акционеров Общества».

*УНП 200167548*



Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА №№ 2424491 **считать недействительным.** *УНП 100122726*


■ Крымінал

## ХАБАРНІЦКІ СЭРВІС

**Падчас атрымання незаконнага грашовага ўзнагароджання затрыманы в.а. намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белмытнясэрвіс» і хабарадавальнік — дырэктар шэрагу камерцыйных структур сталіцы.**

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі таксама начальніка аддзела Мінскага філіяла і супрацоўніка Брэсцкага філіяла «Белмытнясэрвіс», якія таксама атрымлівалі хабар і матэрыяльныя каштоўнасці ад камерсанта. Як паведамляе прэс-служба КДБ Беларусі, цягам чатырох апошніх гадоў толькі в.а. намесніка гендырэктара прадпрыемства паспеў атрымаць звыш 190 тысяч долараў.

Адначасова быў выяўлены буйны нелегальны «фінансавы цэнтр» абнаяўлення грашовых сродкаў. «Цэнтр» уяўляў сабой крэдытна-фінансавую арганізацыю, якая складалася з некалькіх дзясяткаў камерцыйных структур і індывідуальных прадпрымальнікаў, а займалася тым, што «абнаяўлівала» праз асобныя рахункі грошы, выведзеныя «кліентамі» з эканамічнага абароту, а таксама набыццём, абменам і раздачай зацікаўленым суб'ектам гаспадарання замежнай валюты. Затрыманы арганізатар, чатыры яго саўдзельнікі і работнік аднаго з банкаў, які за грашовае ўзнагароджанне спрыяў рэалізацыі ценявых фінансавых аперацый.

Заведзена 5 крымінальных спраў — за атрыманне хабару, даванне хабару, прыняцце незаконнага грашовага ўзнагароджання, ухіленне ад выплаты падаткаў і збораў. Арыштаваны аб'екты нерухомасці і аўтамабілі, якія праходзяць па крымінальных справах. Затрыманыя знаходзяцца пад вартай.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■


**РУП «БЕЛПОЧТА»**
**объявляет о проведении переговоров**

по выбору подрядной строительной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте: **«Текущий ремонт системы холодного водоснабжения общежития по ул. Кульман, 21 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится «05» марта 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

**Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – тел. 293-55-29,293-55-28.**

*УНП 101015738*


■ Факт

## ПАЧУЦЬ НЯБАЧНАЕ

**Зрабіць горад над Нёманам больш даступным для невідушчага чалавека — мэта праекта «Гродна: пачуць нябачнае».**

Дагэтуль краязнаўчая літаратура ў гарадскіх бібліятэках была толькі ў друкаваным выглядзе. Але цяпер, дзякуючы аўдыякнізе з гісторыяй аднаго з найпрыгажэйшых еўрапейскіх гарадоў змогуць лепш пазнаёміцца невідушчыя і слабавідушчыя людзі, якіх у Гродне пражывае каля пяцісот. Аўтары праекта, супрацоўнікі Гродзенскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, удзячны ўсім, хто дапамог ажыццявіць ідэю гэтага выдання і яго прэзентацыю.

50 аўдыякніг «Гродна: пачуць нябачнае» неўзабаве атрымаюць спецыяльныя бібліятэкі для людзей з парушэннямі зроку ў розных рэгіёнах краіны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПА МОСЦЕ З АСЦЯРОГАЙ

**Размова ідзе пра Дняпроўскі мост па Пушкінскім праспекце ў Магілёве, дзе раптоўна абрынуліся «поручні». Яшчэ летась планаваўся яго капітальны рамонт, бо стан ацэньваўся як крытычны. Пачаць яго збіраліся, як толькі стане цёпла, але не раней за май. Аднак мост нечакана пачаў разбурацца.**

6 пралётаў металічнай агароджы агульнай працягласцю 13 метраў абрынуліся проста ў ваду. Толькі па шчаслівай выпадковасці ніхто не пацярпеў.

Улады горада адправілі ў Савет Міністраў ліст з просьбай пачаць рэканструкцыю аб'екта раней. Мост жа працягвае функцыянаваць. Супрацоўнікі ДАІ просяць усіх гараджан захоўваць асцярожнасць.

— Мы раім кіроўцам звяртаць увагу на ўстаноўленыя каля моста 2 знакі — абмежаванне хуткасці да 30 км/г і неабходнасць выконваць дыстанцыю 30 метраў, — адзначыў **начальнік аддзялення ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Яўген ЖЫЛІНСКІ**. — Пешаходам трэба перамяшчацца толькі па супрацьлеглым боку. Праход, дзе рухнула агароджа, закрыты.

Цяпер спецыялісты праводзяць дадатковае абследаванне моста.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ Разам

## МЭТЫ — АГУЛЬНЫЯ

**Ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных 98-годдзю беларускай міліцыі, якія прайшлі ў Магілёве, прынялі ўдзел першы намеснік міністра МУС Беларусі Валянцін МІХНЕВІЧ і прадстаўнікі кіраўніцтва міліцыі Смаленскай і Бранскай абласцей.**

Падчас мітынгу каля памятнага знаку загінулым міліцыянерам намеснік міністра адзначыў, што супрацоўнікі органаў унутраных спраў робяць усё для таго, каб людзі адчувалі на вуліцах бяспеку.

— Кожнае трэцяе правапарушэнне мінулага года здзейснена ў алкагольным стане, — адзначыў Валянцін Міхневіч. — Мы выходзім з шэрагам прапаноў і ініцыятыў, шукаем новыя формы барацьбы з гэтым злом, вывучаем замежны вопыт. Працягваем працу ў рамках Дэкрэта № 6 па супрацьдзеянні нарказлачыннасці. Летась было зарэгістравана 1300 выпадкаў перадазіровак наркотыкамі, 32 чалавекі загінулі. Не здымаем з уліку пытанне па бяспецы дарожнага руху. У мінулым годзе здарылася 50 дарожна-транспартных здарэнняў, калі кіроўцы пакінулі сваіх ахвяр паміраць на дарозе. На жаль, сёлета ўжо ёсць адно такое здарэнне са смяротным зыходам у Гомельскай вобласці. З леташніх 50 фактаў 8 пакуль застаюцца нераскрытымі. Усяго ж на дарогах краіны загінулі 753 чалавекі. Дасягнуць поспехаў у нашай працы немагчыма без удзелу насельніцтва. Па статыстыцы, каля 63–65% жыхароў краіны гатовы аказваць нам садзейнічанне ў прафілактыцы правапарушэнняў.

Не апошнюю ролю ў барацьбе са злачыннасцю адыгрывае сумесная праца беларускіх і расійскіх праваахоўных службаў.

— На жаль, злачынства не ведае межаў, — адзначыў **начальнік упраўлення Міністэрства ўнутраных спраў Расіі па Смаленскай вобласці, генерал-маёр Міхаіл СКОКАЎ.** — Таму мы зараз і падпісалі пагадненне аб далейшым супрацоўніцтве паміж упраўленнямі Смаленскай і Магілёўскай абласцей.

— У якасці прыкладу сумеснай дзейнасці Валянцін Міхневіч прывёў нядаўні выпадак, калі ў Пскоўскай вобласці быў затрыманы злачынца, які абвінавачваецца ў забойстве на тэрыторыі Беларусі і 14 гадоў хаваўся ад правасуддзя. Зараз яго чакае экстрадыцыя ў Беларусь. Сумесная праца вядзецца і па спыненню распаўсюджвання фальсіфікаваных спіртных напояў. Летась іх было канфіскавана ў Беларусі каля 2 мільёнаў літраў. Зараз робіцца шэраг сумесных напрацовак па спыненні ачагоў вытворчасці гэтых фальсіфікатаў на тэрыторыі Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Хто каго?

# «ДЗВЕ КАРОЎКІ НА КАЗУ АБМЯНЯЎ АНТОНІК…»

**Што было — было, бо такое, каб і хацеў, наўрад ці прыдумаеш. У горадзе дзве маладзіцы сустрэліся (адна — замужняя, з пяцігадовай дачушкай, другая — дзеўка яшчэ), у нейкую кавярню зайшлі, штось замовілі, сядзяць, гамоняць. Незамужняя на сваю долю скардзіцца. Маўляў, што цяпер ні мужчына — казёл: «Так і глядзіць, каб я вакол яго тупала, каб даглядала, а каб ён мяне — дык нават не падумае!..»**
**Малая, гэта пачуўшы, устала з-за свайго століка, падышла да суседняга, дзе сядзелі двое мужчын, і спытала:**
**— Дзядзечкі, бачыце вунь тую цёцю?**
**— Ну.**
**— А можаце крыху падаглядаць яе? А то мама неяк пра нашу хамячыху забылася — два дні не даглядала, дык ад яе такі смурод быў…**

Ці трэба казаць, што маладзіц ад гэтых слоў з кавярні як ветрам выдзьмула! А вось мужчыны — засталіся. І рагаталі, кажуць, так…

Зрэшты, сёння размова не пра іх, не пра мужчын, і нават не пра казлоў — амаль што. «Вочы неяк самі «зачапіліся» за новы конкурсны здымак, бо на ім жа козачка! — прызнаецца **спадарыня Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна.** — Акурат як наша Цыганачка… А ўсяго іх дзве. З казлянятамі і болей бывала. Мужу яны вылечылі язву, мне дапамагаюць змагацца з бранхітам. Так што козак мы вельмі паважаем!.. Чаму вось гэтая ды раптам у «карэце»? Адказаў можа быць шмат».

І ёсць! Бо гэтай казой, як прызнаецца чытачка, яна ўсіх сваіх сямейнікаў «дастала». «Муж папросіць нешта зрабіць, — я тут жа яму ўмову: «А радок у рыфму падкажаш?..» Ён для прыліку трохі пасварыцца, але ж потым нештачка і выдасць».

Прыклад? Калі ласка:

*Дзве кароўкі на казу*
*Абмяняў Антонік…*
*Засталося абмяняць*
*І каня — на поні.*

Вы скажаце, што гэта нейкія нераўнацэнныя абмены? І сапраўды, калі ў корань не глядзець, калі не чуць, як адна кабета кажа другой:

*— Зяць чакае дапамогі.*
*Мы — з гуманітарнаю:*
*Паглядзі, кума, на рогі,*
*Козка — элітарная!*

Чым такім адметная? Ды не злічыць! Ну па-першае, як паведамілі сужэнцы Пятроўскія, яна лечыць (і не толькі язвы ды бранхіты). Бяры болей, як піша **спадарыня Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны:**

*— Зацяжка ўжо трымаць кароўку —*
*Тады хоць козак на вяроўку.*
*Надоім меней малака,*
*Ды будзе сіла ў мужыка!*

Гэта, па-першае. А па-другое — грошы! Як піша **спадарыня Марыя Грышчанка з Дзяржынска:**

*Усіх вяскоўцаў малаком*
*Забяспечыць дзед Пахом:*
*Жонку, козачку — на воз*
*І па вуліцах павёз.*
*Гандаль борзда ў іх ідзе:*
*Сэрвіс, так бы мовіць —*
*Каму шклянку, каму дзве*
*«Свежачка» надояць.*

І нештачка ўтаргуюць! Аднак выгада, на думку **спадара Анатоля Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна,** не толькі ў мільёнах:

*Гэтым жонка мужыка*
*У руках трымае:*
*За тры літры малака*
*Чарку налівае.*

А магла б і больш, бо, як мяркуе **спадар Мікола Кісель з Мінска,** тыя тры літры ну вельмі цяжка даюцца:

*У козкі нораў — не дай Божа,*
*Дзед яго трываць не можа:*
*Раніцой не пакатаеш —*
*Малачка не атрымаеш!*

Значыць, катае-такі? Ці ўжо збрыдзела: ён тую козку на рынак вязе ды час ад часу на размовы спыняецца?

Адну з іх «падслухалі» **сужэнцы Астроўскія з Мінска:**

*— Ой, суседка, што я чую!*
*Можа, Богу не грашы?!*
*Няўжо козачку такую*
*Прадасі на кірмашы?*

Што адказвае суседка, не падслухаў ніхто, а вось што яе муж (ён да жанчынак спінай сядзіць), пачула **спадарыня Грышчанка:**

*Сваю жонку і казу*
*На базар я завязу.*
*Бабу маю не старую —*
*Скрыню грошай утаргую!*

І што — тая скрыня яго прывеціць?.. Абдыме, пашкадуе? Нейкай смакаты напячэ? Не! Гаспадыня ў хаце — вось яно, багацце! Як і гаспадар, дарэчы. А калі яно, тое багацце, завялікае ўжо, то ім (на думку **спадарыні Ларысы Салей са Скідаля)** і падзяліцца можна:

*Дзед і баба ў воз паселі*
*І — гайда на наваселле!*
*Конік ведае кірунак,*
*Козка — найлепшы падарунак…*
*Ды суседка ім сказала,*
*Што казы цяпер — замала:*
*— Каб зяцёк не супіў бровы,*
*Падарыце й гэты ровар.*

Во якія людзі ў вёсцы! Свой веласіпед гатовы аддаць, каб чужому зяцю дагадзіць! А таму… далучайцеся! Пажадана — такія ж добрыя, шчырыя, непітушчыя і… нежанатыя. Ім **сужэнцы Пятроўскія** адкрытым тэкстам пішуць:

*Прыязджайце кумак сватаць!*
*Бачыце — багатыя:*
*Маюць хаты, самакаты*
*І казу рагатую.*

Карацей, маюць кумкі ўсё, што трэба! А значыць, можа і адгукнецца хто (у пошуках гаспадыні і грошай) на гэты заклік. Бо пісаў жа некалі Васіль Шукшын, што пазбіраюцца людзі ў вялікіх смярдзючых гарадах, а потым паразбягаюцца ў чыстае поле.

Але ж пакуль, як сведчыць здымак (і вырыянт подпісу да яго ад **спадара Сцяпана Нефідовіча з Лунінечыны),** назіраюцца іншыя працэсы:

*— Бывай, сяброўчка з сяла,*
*Мне сёння выпала ўдача:*
*Купіў Іван майго казла,*
*Яшчэ й мяне бярэ ў прыдачу!*

Во як здараецца паміж пакупнікамі і гандлярамі, паміж мужчынамі і жанчынамі! Хоць паразуменне (прынамсі паміж тымі, што на возе), як лічыць **спадарыня Чыгрынава,** узнікла не адразу:

*Маня Янку гаварыла:*
*— А навошта ж вам казёл?..*
*Бо таго не палічыла,*
*Колькі ён «абслужыць» сёл!*

Трэба разумець, многа? Бо «элітарны»!.. І зноў жа не «за так»!

Зрэшты, козлік, ды гэтакі прыгожанькі (на думку **спадарыні Гудачковай з Жыткавіч),** можа ехаць не толькі па справах:

*Нарэшце!.. Пашана*
*жывёльнаму свету:*
*Казлу з агарода*
*зрабілі «карэту»…*
*Павезлі ў горад яго на выставу:*
*Ну, хочацца людзям*
*і грошай, і славы.*

Магчыма, якраз пра іх, тыя грошы, славу, выставу, кабеты і гамоняць. Прычым гамоняць даўно. Мужыку, што на возе, «слухаць» збрыдзела: сядзіць ды сам сабе думае (запісала **гамяльчанка Раіса Васільева):**

*— Даць бы добрай лазы,*
*Бо балбочуць, балбочуць…*
*Ажно ў беднай казы*
*Павылазілі вочы!*
*Данялі, дапяклі,*
*Аж у роце ўжо горка:*
*Ну калі ўжо, калі*
*Сціхне ваша гаворка?!*

Адказу на гэтае пытанне ў рэдакцыйнай пошце няма. Ёсць хіба здагадка — у **спадарыні Чыгрынавай:**

*Стрэлісь бабы на базары —*
*Тары-бары-растабары…*
*Балбатні ў дзвюх кабет*
*Ад світанку — пад абед!*
*Аж шапнула Верцы Каця:*
*— Ты — начальніца у хаце…*
*Ну й ціхмяны ў цябе муж,*
*Мой — даўно ўзяў бы гуж!*

Альбо і што іншае прыдумаў бы:

*Дзе дзве бабы, там — базар,*
*Гэта і не дзіва.*
*Мужыку ж які навар*
*Слухаць іхні тарабар?!.*
*Лепш бы выпіў піва!*

Што праўда, тое праўда: хто не пагодзіцца са **спадаром Валерыем Гаўрышам з Чавусаў!** І хто з мужчын, глянуўшы на здымак яшчэ раз, не… парадуецца разам са **спадаром Анатолем Гарачовым з Іўеўшчыны:**

*Па зіме садочкі*
*У прыгожых шатах…*
*Ад'язджае прочкі*
*Цешча з нашай хаты!*

Чаму з казой? А таму што іншы раз і карову аддасі, толькі б яна з'ехала! Куды-небудзь падалей… Анекдот, да слова. Цешча ў дварыля машыны круціцца. Зяць, адчыніўшы акно: «Мама, а куды гэта вы сабраліся?» — «На могілкі, сынок». — «А хто машыну дамоў прыгоніць?»

Канфлікт пакаленняў, як той казаў… Нявестка са свякроўю таксама не заўжды ўжываецца. З'язджае вось… Спадар Анатоль «развітальны маналог «падслухаў»:

*— Час, як рэчачка, бяжыць,*
*Ды не бачна зрухаў:*
*Вельмі цяжка стала жыць*
*Мне са злой свякрухай.*
*Бач, дадому ўсё вязу,*
*Бо яна сказала:*
*«Забірай сваю казу!»*
*І… казла таксама.*

Атрымліваецца, родная маці гэтак сына заве?! Самы час яму крыўдзіцца? **Сужэнцы Астроўскія** лічаць, што не варта:

*Сімвалы-прывіды*
*Побач з чалавекам,*
*І мянушкі носяць*
*Многія спрадвеку.*
*Ёю пакаралі?*
*Крыўдзіцца не варта:*
*Як казлом назвалі,*
*Значыць, ты ўпарты.*

І хто сказаў, што гэта дрэнна? Як лічыць **спадар Гарачоў,** нічога падобнага:

*Я і жонку, і казу*
*Да Варшавы давязу.*
*Там змяню каня на «бус» —*
*І гайда ў Еўрасаюз!*

Трэба гэта, не трэба — меркаванні розныя ёсць… **Спадарыня Маркушэўская з Баранавіччыны** выказвае адно і бясспрэчнае:

*У пятнаццатым у годзе*
*Козы белыя не ў модзе…*
*Разам з бурымі, з Усходу,*
*Мы завозім лад і згоду!*

Хто супраць? Мусіць, няма такіх. Тады яшчэ два кароткія назіранні — ад **спадара Віктара Трайкоўскага з Мінска:**

*Плачуць казляняты —*
*Самы час дахаты:*
*Адышлі Калядкі,*
*Скончыліся святкі!*

Шкада, вядома ж. А яшчэ больш таго, што:

*Вёска горад даганяе,*
*Бач, кароў на коз мяняе.*
*Потым — козак на катоў*
*І… «працэс» ужо гатоў.*

Гэта — прагноз ад **спадарыні Марыі Кахоцкай з Воранаўшчыны.**

Да слова, пра яго ж, пра гэты «працэс», Рыгор Барадулін вельмі трапна сказаў: гэта не мы, маўляў, пакінулі вёску, гэта яна:

*Усіх пакінула за тое,*
*Што ўсе зняважылі яе.*
*А пад жалезнаю пятою,*
*Як пад магільнаю плітою,*
*Трава ў абразе не ўстае.*

Зрэшты, не будзем пра сумнае, а тым больш што ў пошце ёсць радкі (ад **сужэнцаў Астроўскіх),** якімі можна падсумаваць увесь гэты россып подпісаў:

*Хай мужчыны кажуць штось,*
*Хай кабеты трэплюцца,*
*Калі ў скрыні козка ёсць —*
*Гаспадарка цепліцца!*

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і можна было б паставіць кропку, аднак трэба падвесці вынікі. Нагадаем, што на папярэднім здымку («Звязда» 17 студзеня) быў адзін нечым заклапочаны хлопец. Ён не тое стаяў, не тое праходзіў міма чатырох дзяўчат, што сядзелі на лаўцы… Дык вось па меркаванні вялікага чытацкага журы найлепшыя радкі пра гэту «кампанію» склалі **спадары Гаўрыш з Чавусаў, Гарачоў з Іўеўшчыны, Старых з Гомеля, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Маркушэўская з Баранавіччыны, Гудачкова з Жыткавічаў, Чыгрынава з Вілейшчыны, Грышчанка з Дзяржынска, Пятроўская са Смаргоншчыны і Алена Муляр з Бабруйска.** З гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Гэта значыць, што прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцу «Звязду» на другі квартал бягучага года накіроўваецца ў Бабруйск.

Хочаце, каб да вас? Новы здымак унізе: разглядайце, думайце, падключайце сямейнікаў, пішыце (коратка, трапна, па-беларуску), дасылайце. Не выйграе той, хто не гуляе.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

***Ад іх жа*** *заўсёдная ўдзячнасць усім, хто чытаў, пісаў, а таксама шчырыя прабачэнні тым, чые радкі не вытрымалі канкурэнцыі, не прайшлі строгага конкурснага адбору на гэты раз, — але ў наступны…*

■ Спорт-тайм

# НАЗАД ДА ВЯРШЫНІ. КРОК ЗА КРОКАМ...

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра перамогу БГК, які паступова набірае форму, рэйтынгавы скачок Вікторыі Азаранкі і мінскіх «Цмокаў», што працягваюць калекцыянаваць паражэнні.**

**1.** Хакейнае **«Дынама-Мінск» саступіла другі матч 1/8 фіналу Кубка Гагарына** фінскаму «Ёкерыту» — 1:4. Такім чынам лік у серыі стаў роўным — 1:1.

«У гэтай сустрэчы пачатак быў за намі: ужо на першых хвілінах у Мэта Элісана быў добры момант, калі ён кідаў з выдатнай пазіцыі, — адзначыў пасля матча **галоўны трэнер «Дынама» Любамір ПОКАВІЧ.** — Шмат атакавалі, але часта не маглі трапіць у створ варот і, адпаведна, забіць. Усё вырашылася ў другім перыядзе, дзе хапала ўзаемных памылак, але сапернік свае магчымасці выкарыстаў лепш».

Як змяніўся лік сустрэч «Дынама» і «Ёкерыта», вы ўжо ведаеце. Трэці матч серыі скончыўся ўчора позна ўвечары. Сёння каманды правядуць яшчэ адзін паядынак на «Мінск-Арэне».

**2. Вікторыя Азаранка ўзнялася ў сусветнай класіфікацыі на дзесяць пазіцый** і цяпер займае 38-мы радок. На мінулым тыдні беларуская тэнісістка дайшла да фіналу прэстыжнага турніру катэгорыі прэм'ер у Досе. На шляху да вырашальнага матча Азаранка перайграла пятую ракетку свету Каралін Вазняцкі, чатырнаццаты нумар рэйтынгу Анжалік Кербер і старэйшую з сясцёр Уільямс — Венус. Але ў фінале наша спартсменка не справілася з чэшскай тэнісісткай Луцыяй Шафаржавай, саступіўшы 4:6 3:6. Адзначым, што пасля гэтай перамогі Шафаржава ўзнялася на 11-ты радок сусветнай класіфікацыі. Гэта найлепшы паказчык чэшкі за кар'еру.

Вікторыя Азаранка саступіла ў фінале, але пачала прасоўвацца ўверх па рэйтынгу.

«На турніры ў Досе я хацела згуляць шмат матчаў запар, каб прызвычаіцца да такога рытму. І дзякуючы таму, што дайшла да фіналу, я ўбачыла, над чым трэба працягваць працаваць, — сказала **Вікторыя АЗАРАНКА** пасля фіналу. — Я па-ранейшаму вельмі матываваная. Праз тыдзень распачнецца наступны турнір, і мне трэба да яго добра падрыхтавацца. Але я адчуваю прагрэс, якога я дамаглася з тых часоў, як гуляла на папярэднім турніры».

**3. БГК імя Мяшкова атрымалі чарговую перамогу ў SEHA-лізе.** На хатняй арэне брастаўчане перайгралі македонскі «Металург» — 25:23. **Галоўны трэнер БГК Жэлька БАБІЧ** так ацаніў сыход паядынку: «Ведаў, што матч будзе няпростым. Важна, што выйгралі. Былі моманты ў нашай гульні, калі хлопцы дзейнічалі проста выдатна. Каманда паступова набірае форму. Да паядынку з «Татранам», думаю, будзе ўсё добра, і мы яшчэ раз выйграем».

**4. Баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск» саступіў краснаярскаму «Енісею»** — 84:91. Самым выніковым у складзе мінчан у чарговы раз стаў Іван Мараш, які набраў 28 ачкоў. Адзначым неблагую статыстыку дэбютанта каманды — амерыканца Джасціна Грэя, што назбіраў 13 балаў. Гэта паражэнне стала сямнаццатым у сезоне (пры дзвюх перамогах) для падапечных Ігара Грышчука.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

У палёце беларуска Ганна Гуськова.

## На вышыні!

**У спарткомплексе «Раўбічы» скончыўся этап Кубка свету па лыжнай акрабатыцы, які завяршыў праграму сезона 2014—2015. Найлепшым сярод мужчын стаў украінскі фрыстайліст Аляксандр Абраменка, другое месца — за амерыканцам Макам Бахонанам. Дзякуючы патроенаму сальта з трыма піруэтамі ўзыйсці на п'едэстал за бронзавым медалём змог і беларускі спартсмен Дзяніс Осіпаў. У дзяўчат золата і серабро атрымалі амерыканкі Эшлі Колдуэл і Кайлі Макінан, бронзу — фрыстайлістка з Расіі Вераніка Карсунова.**

Фота Надзеі БУЖАН.

Дзяніс Осіпаў (першы справа) завяршыў спаборніцтвы з бронзавым медалём.

# Гараскоп стрыжак на сакавік

**3 сакавіка, аўторак.** Абавязкова зрабіце ў гэты дзень стрыжку. Ці хаця б падстрыжыце грыўку — яна дабавіць вобразу запалу, а на ўзроўні энергетыкі дапаможа засваенню новай інфармацыі.

**4 сакавіка, серада.** Стрыжка ў гэты дзень умацуе вашыя валасы, яны будуць менш секчыся.

**5 сакавіка, чацвер.** Добры дзень для стрыжкі. Пафарбуйце валасы ў свой натуральны колер — гэтым вы прыцягнеце да сябе патрэбных людзей.

**6 сакавіка, пятніца.** Выдатны дзень для наведвання цырульні. Фарба для валасоў ляжа роўна, яе колер доўга не паблякне, а стрыжка зробіць вас больш рашучымі.

**7 сакавіка, субота.** Прычоска, зробленая сёння, будзе мець чароўныя ўласцівасці. Стрыжка, укладка ці афарбоўка прынясуць сваёй гаспадыні ўдачу ў асабістым жыцці.

**8 сакавіка, нядзеля.** 19-ы месяцовы дзень вельмі неспрыяльны для стрыжкі, афарбоўвання і іншых цырульніцкіх працэдур.

**9 сакавіка, панядзелак.** Стрыжка супрацьпаказаная — можа стаць прычынай непрыемнасцяў.

**10 сакавіка, аўторак.** Стрыжка ў гэты дзень робіць валасы непаслухмянымі. Аднак тым, хто хоча, каб валасы пасля стрыжкі мелі схільнасць завівацца, гэта можа быць і на карысць.

**11 сакавіка, серада.** Дзень для стрыжкі зусім нейтральны, ні на што не будзе ўплываць.

**12 сакавіка, чацвер.** У выніку стрыжкі ўзрасце чароўнасць вонкавага аблічча, вы будзеце падабацца людзям.

**13 сакавіка, пятніца.** Абавязкова падстрыжыце валасы ў гэты дзень, каб зрабіць сваё жыццё ярчэйшым і цікавейшым.

**14 сакавіка, субота.** Спрыяльны дзень для візіту ў салон. Аднак пры гэтым не варта эксперыментаваць і рэзка мяняць звыклы для вас вобраз.

**15 сакавіка, нядзеля.** Спрыяльны дзень для стрыжкі, аднаўлення пашкоджаных валасоў.

**16 сакавіка, панядзелак.** Ідэальны дзень для таго, каб змяніць свой імідж, таму вы можаце рабіць любую стрыжку.

**17 сакавіка, аўторак.** Вельмі спрыяльны дзень для наведвання цырульніка, можна паэксперыментаваць з даўжынёй валасоў і формай прычоскі.



**18 сакавіка, серада**. Сёння не варта наведваць цырульніка — стрыжка негатыўна адаб'ецца на структуры валасоў і на ўласнай самаацэнцы.

**19 сакавіка, чацвер.** На календары — неспрыяльны дзень для стрыжкі.

**20 сакавіка, пятніца.** У дзень сонечнага зацьмення ўсе маніпуляцыі з валасамі лепш адкласці.

**21 сакавіка, субота.** Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, паскарае рост валасоў, але са стратай іх якасці. А вось фарбаваць валасы можна абсалютна ў любы колер. Афарбоўка зменіць імідж і зробіць колер твару больш роўным.

**22 сакавіка, нядзеля.** Добры дзень для стрыжкі і наогул для догляду сваёй знешнасці.

**23 сакавіка, панядзелак.** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Афарбоўванне натуральнымі фарбавальнікамі прыцягне ў жыццё энергію грошай і сацыяльнай паспяховасці.

**24 сакавіка, аўторак.** Стрыжка ў гэты дзень не зменіць структуру і якасць валасоў, яны будуць хутчэй расці.

**25 сакавіка, серада.** Спрыяльны час, стрыжка ў гэты дзень не будзе адрастаць вельмі доўга, а афарбоўка будзе на здзіўленне стойкай.

**26 сакавіка, чацвер.** Сёння ўстрымайцеся ад любых цырульніцкіх працэдур — вы наўрад ці атрымаеце добры вынік.

**27 сакавіка, пятніца.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, афарбоўкі і завіўкі валасоў. Калі пастрыгчы валасы ў гэты дзень, яны стануць непаслухмянымі і калматымі, стрыжцы не атрымаецца надаць патрэбны выгляд, прычоска будзе бясформенай.

**28 сакавіка, субота.** Сёння сатанінскія 9 месяцовыя суткі, стрыгчы і афарбоўваць валасы не рэкамендуецца.

**29 сакавіка, нядзеля.** Спрыяльны час для догляду сваіх валасоў.

**30 сакавіка, панядзелак.** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Валасы, падстрыжаныя ў гэты дзень, стануць мацнейшымі і пышнейшымі, хутка адрастуць.

**31 сакавіка, аўторак.** Спрыяльны дзень для наведвання салона. У гэты перыяд паляпшаецца структура і паскараецца рост валасоў.

■ Факт

# МЕСЯЧНІК ПЕРАД ГАДЗІНАЙ ЗЯМЛІ

**Экалагічная акцыя «Месяц простых і карысных спраў перад Гадзінай Зямлі» стартавала ў краіне. Яе ініцыятарам выступіў Цэнтр экалагічных рашэнняў.**

Арганізатары прапануюць, падгледзеўшы на сайце justdoit.ecoidea.by нараду, зрабіць што-небудзь карыснае для планеты. Штодня на старонцы будзе даступная новая «зялёная» нарада. Месяц простых і карысных спраў завершыцца 28 сакавіка 2015 года глабальнай сімвалічнай акцыяй па выключэнні святла на гадзіну.

Да 27 сакавіка 2015 г. на электронную пошту spare@ecoidea.by з пазнакай «Месяц карысных спраў» можна дасылаць творчыя справаздачы і фота пра тое, што карыснага ўдалося зрабіць у гэтыя дні. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымаюць сімвалічныя падарункі — свечкі праекта ШПІРЭ — і Гадзіну Зямлі змогуць правесці як адна вялікая «энергазберагальная» сям'я!

**Надзея НІКАЛАЕВА**

**ДЛЯ ДАВЕДКІ:** Гадзіна Зямлі — міжнародная акцыя, падчас якой у розных краінах свету на адну гадзіну выключаецца асвятленне і ўсе электрапрыборы ў знак неабыякавасці да будучыні планеты. У гэты ж час згасае падсветка самых вядомых будынкаў (у Беларусі гэта — Нацыянальная бібліятэка). У 2015 годзе Гадзіна Зямлі пройдзе 28 сакавіка з 20.30 да 21.30.

■ Ну і ну!

# АГРЭСІЎНЫ НАХАБНІК

**За адзін вечар на трох жанчын напаў зламыснік у Брэсце і адабраў сумкі і пакеты. Паведамленні на пульт аператыўнага дзяжурнага паступалі з вуліц у раёне аўтавакзала. Там хуліган і высочваў сваіх ахвяр.**

Першай стала 70-гадовая пенсіянерка: у яе рабаўнік выхапіў пакет з прадуктамі і ўцёк. Літаральна праз дзесяць хвілін злодзей спрабаваў адабраць сумачку ў 52-гадовай жанчыны. Яна актыўна абараняла сваю маёмасць і атрымала пераломы абедзвюх рук. Апошняй пацярпелай у той вечар стала жыхарка Драгічынскага раёна, што спяшалася на вакзал. У яе агрэсіўны нахабнік сумку адабраў і пры гэтым зламаў руку жанчыне.

